БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА



РАБОТНІЦЫ ПІШУЦЬ ЗАЯВУ АБ УСТУПЛЕНЬНІ Ў ПАРТЫЮ.

№ 23

Сьнежань 1929

Будуем трактар імя часопісі „Беларуская Работніца і Сялянка“.

Уносім і выклікаем.

Саматужна-Прамысловая арцель „Ментрыкатаж“ уносіць у фонд пабудовы трактара імя „Беларуская Работніца і Сялянка“ 35 р. 85 к. і выклікае пасьледваць нашаму прыкладу арцелі панчошнікаў—„Пралетары“ і „Маць і Дзіця“.

Дэлегатка **Рухавец.**

Што мы парашылі.

Канфэрэнцыя чытачак, карэспандэнтак і ўпаўнаважаных „Беларускай Работніцы і Сялянкі“ г. Менску парашыла:

1. Чытачкам часопісі ўзяць шэфства над адным з калгасаў, праз часопісь, арганізаваць збор сродкаў на трактар імя „Беларускай Работніцы і Сялянкі“, які перадаць у падарунак падшэфнаму калгасу. Чытачкі гораду Менску заклікаюць усіх працоўных жанчын Беларусі прыняць удзел у зборы сродкаў.

2. Канфэрэнцыя зьвярнулася да Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў з заклікам, больш адбіць працу і быт работніц і працоўных салянак у мастацкіх творах, зьмяшчаемых на старонках часопісі.

3. Канфэрэнцыя зьвярнулася да працаўнікоў саюзу нарсувязі—ў парадку сацспаборніцтва наладзіць справу з дастаўкай часопісі.

Работніцы, батрачкі і ўсе працоўныя жанчыны, адгукнецеся на заклік менскіх чытачак—дамо трактар у падарунак калгасу.

Грошы і выклікі накіроўвайце ў рэдакцыю „Беларуская Работніца і Сялянка“.

Выклікаем шчотачніц.

Па ініцыятыве дэлегацкага сходу рабочыя Менскай абутковай фабрыкі ўносяць 73 р. на трактар імя „Беларуская работніца і сялянка“.

Мы выклікаем пасьледаваць нашаму прыкладу ўсіх дэлегатак, работніц і жонак рабочых шчотачнай фабрыкі.

Дэлегаткі.

Хто ня ведае „Беларускую Работніцу і Сялянку“.

Пятнаццаць тысяч пяцьсот падпішчыкаў мае часопісь „Беларуская работніца і сялянка“. Але ёсьць цэлыя раёны, у якіх ня ведаюць пра нашу часопісь, яе ня выпісвае ніводная жанчына.

Якія-ж гэта раёны?

У Менскай акрузе—Бягомльскі і Грэскі р-н.

У Полацкай акр.—Вушацкі раён.

У Магілеўскай акр —Чачэвіцкі р.

У Мазырскай акрузе—Тураўскі, Лельчыцкі, Нараўлянскі і Юравіцкі раёны.

У Бабруйскай акрузе—Старобінскі і Любаньскі раёны.

У Гомельскай акрузе—Лоеўскі, Брагінскі і Камарынскі раёны.

Вось у гэтых раёнах на лістапад месяц ня было ніводнага падпішчыка на „Беларускую работніцу і сялянку“. У Журавіцкім раёне, Магілеўскай акругі — быў толькі адзін падпішчык.

Часопісь „Беларуская работніца і сялянка“ зьяўляецца калектыўным арганізатарам працоўных жаночых мас вакол партыі, для актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве.

Дэлегаткі, грамадчыцы, актывісткі названых раёнаў! Разгарнеце работу па прасоўваньню „Беларускай работніцы і сялянкі“ ў гушчы працоўных жанчын вашых раёнаў.

Мы выклікаем.

Дэлегаткі Менскай абутковай фабрыкі ўсе падпісаліся на „Беларускую Работніцу і Сялянку“ і выклікаем на сацыялістычнае спаборніцтва ўсіх работніц і жонак рабочых абутковай фабрыкі і скурзаводу „Бальшавік“.

Дэлегацкі сход просіць праз друк паведаміць аб прыняцьці выкліку.

73.

Быхаўскі зьмешаны дэлегацкі сход выпісаў 73 экзэмпляры „Беларускай Работніцы і Сялянкі“.

Ніводная актывістка не павінна быць бяз гэтай часопісі, таму мы выклікаем сьледаваць нашаму прыкладу—вясковы дэлегацкі сход, жонак вайсковых 98 палка і работніц заводу „Ільліч“.

Дрынева.

Ці ты ўжо падпісалася —) на часопісь (—

Ці ты ўжо падпісалася —) на часопісь (—

„Беларуская Работніца і Сялянка“

Падпіску можна здаваць на пошту, лістаносцам, у кіёскі ці прысылаць непасрэдна ў рэдакцыю.

Часопісь каштуе— у месяц: . . . . 15 капеек | Паўгода . . . . 90 капеек
3 месяцы . . . 45 „ | Год . . . . 1 р. 80 „

Цана асобнага нумару 10 кап.

Упаўнаважаныя па падпісцы атрымоўваюць 10 проц. з сабранай сумы.

Кожная актывістка, грамадчыца, дэлегатка, работніца, калгасьніца, саўгасьніца, бяднячка і сераднячка—павінна чытаць сваю часопісь „БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА“.

Кожная актывістка павінна распаўсюджваць гэту часопісь.

Чытайце, распаўсюджвайце і пішыце ў сваю часопісь.

Адрас рэдакцыі: Менск, вул. Карла Маркса, 14, тэлефон—2-43.

И.н.б. № 13

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

№ 23. ОРГАН АДДЗЕЛУ РАБОТНІЦ І СЯЛЯНАК ЦК КП(б)Б. Сьнежань, 1929 г.

Делегацкія сходы павінны працаваць пановаму.

Ужо пачалі працу новаабраныя дэлегацкія сходы ў горадзе і вёсцы, але-ж кампанія перавыбараў яшчэ не пад'агулена, яшчэ не асьвятляліся вынікі гэтай політычнай кампаніі сярод работніц і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства.

Вынікі гэтыя трэба падвесьці для таго, каб улічыць той зрух, які выявіўся ў час гэтай масавапалітычнай кампаніі і намеціць шляхі, якія павінны ператварыць дэлегацкія сходы ў сяпраўдныя арганізаваныя адзінкі грамадзкай работы на прадпрыемстве, у калгасе, саўгасе сярод бядняцка-серадняцкіх мас сялянак.

Што паказалі перавыбары дэлегатак?

Першае, гэта тое, што ахоп мас на сходах, а таксама актыўнасьць абірацельніц, удзельнічаючых на перавыбарах дэлегатак, у гэтым годзе значна ўзрасьлі. Гэта тлумачыцца тым, што партыйныя арганізацыі больш аддалі ўвагі справе падрыхтоўкі перавыбараў. Упяршыню мы мелі значны ўдзел работніц гораду ў перавыбарах дэлегатак на вёсцы ў форме пасылкі брыгад, шэфства і індывідуальнага ўдзелу актывістак у перавыбарах. Упяршыню таксама быў уведзен, пры ўдзеле профсаюзных і кааперацыйных організацый мэтад організацыі бытавых аднадзённых дзіцячых прытулкаў у горадзе і ў вёсцы, які сябе добра апраўдаў. Матар'ялы з месц гавораць, што на прадпрыемствах ахоп абіральніц даходзіць месцамі да 90—100% (Віцебск, Бабруйск), а на вёсцы да 75% (Менск, Мазыр).

Ці змаглі мы накіраваць увагу шырокіх мас абіральніц на вырашэньне асноўных задач партыі па соцыялістычнай рэканструкцыі народнае гаспадаркі, рацыяналізацыя вытворчасьці, калектывізацыі вёскі, рашучаму наступленьню на капіталістычныя элемэнты.

Трэба адзначыць, што ня ўсюды на мясцох змаглі ўвязаць перавыбары з асноўнымі пытаньнямі, стаячымі ў данай мясцовасьці. Але-ж у асноўным дырэктыва ЦК нашай партыі ў гэтым напрамку выканана здавальняюча.

Мы маем шэраг прыкладаў, гаворачых аб тым, што ў выніках кампаніі перавыбараў узрос удзел работніц у сацыялістычным спаборніцтве, ва ўдарных брыгадах, былі растлумачаны батрачкам, бяднячкам і сераднячкам пытаньні, зьвязаныя з калектывізацыяй.

Вось факты: пры правядзеньні перавыбараў на заводзе „Ноўкі" на перавыбарным сходзе было завострана пытаньне аб удзеле ў ударных брыгадах і тут-жа на сходзе запісалася 9 старых дэлегатак, якія выклікалі новых дэлегатак і работніц. У выніку гэтага была створана ўпяршыню ўдарная брыгада з 95 чалавек, з іх 70% дэлегатак; ці на сходзе Шчотачнай ф-кі ў Віцебску група старых і новых дэлегатак з 17 асоб выклікалі на соц. спаборніцтва усіх работніц па палепшаньню якасьці вытворчасьці, паменшаньню прагулаў і запісаліся ў ударную брыгаду.

Сходы скарыстоўваліся для дадатковай падпіскі на 3 пазыку індустрыялізацыі. Толькі па першаму раёну ў Віцебску было сабрана падпіскі на пазыку на 5989 р. На 8 сходах была організавана здача цэнных рэчаў (залатыя кольцы, крыжыкі, сергі) у фонд абароны. Да дня выбараў дэлегатак у Грэску і Шыпшыцы (Менская акруга) былі організаваны чырвоныя абозы, організатарамі якіх былі сялянкі, якія з чырвонымі сьцягамі адвозілі хлеб у кааператыў. Там-жа была на сходзе прынята прапанова аб організацыі трактарнай калёны і было сабрана 1500 р. сродкаў па раёну на гэтую мэту.

У Кузьменскім с/с. (Бабруйск) сход пастанавіў усім уступіць у калгас у сувязі з організацыяй у гэтым месцы калгасу. У вёсцы Убалаць (Мазыр) на другі дзень пасьля сходу 2 сялянкі прышлі ў с/с. за парадай—„іду ў калгас, а мужык ня хоча" справа даходзіла да разводу).

У Стара-Дароскім раёне на адным з сходаў жанчын падпісаліся на 250 р. на пазыку.

Клясавая барацьба вакол перавыбараў у гэтым годзе была асабліва завострана. У вёсцы Андрэяўка на сходзе абмяркоўвалі пытаньне аб хлебанарыхтоўках. Кулачкі і падкулачнікі адмаўляліся ад нормы вызначанай с.-саветам. Супроць іх выступала актыўна дэлегатка з вёскі, Начкіна, якая гаварыла: „Андрэяўцы яшчэ больш трэба павялічаць норму, бо кулакі вывозяць хлеб у Калінкавічы і прадаюць па 5-6 руб. за пуд". Кулакі парашылі **адпомсьціць Начкінай.** Пасьля сходу кулакі патушылі лямпу і з крыкам — „Бей" накінуліся на бяднячку. Дэлегаткі ледзь выратавалі **Начкіну з кулацкіх кіпцюроў. Кулакоў аддалі пад суд (Мазыр).**

Кулакі выступалі адчынена супроць праводзімых мерапрыемстваў і гаварылі, што „Савецкая ўлада зьбяднела", „Калгасы—гэта быўшая панщына". Бяднячкі давалі добры адказ на гэтыя спробы кулака ганьбіць нашы мерапрыемствы. З Воршы пішуць: „На выступленьне заможных быў абураны адказ бяднячак і сераднячак, якія гаварылі „правільна", што такому жыцьцю, якога хочуць кулакі, прышоў канец і ўлада добра робіць, што не дае спэкуляваць хлебам, эксплёатаваць беднату".

Ці „3-ю пазыку нам неабходна праводзіць хутчэй: будзе разгорнута прамысловасьць, а з ёй і сельская гаспадарка". У Жыткавіцкім раёне ў прымежнай польскай вёсцы Лагвошча, у якой за час перавыбараў організаваўся калгас, на агітацыю кулачак, што ў калгасы ідуць толькі гультаі, бяднячкі арганізавана выступалі супроць кулацтва.

„Мы больш на кулака працаваць ня будзем і пойдзем у калгас".

Маецца шмат такіх прыкладаў амаль з усіх раёнаў.

Новы склад дэлегатак падлічан толькі па 3 акругах (Гомель, Мазыр, Полацак); па гэтых акругах мы маем наступныя дадзеныя: па гораду абрана 1066 дэлегатак, па вёсцы—10308.

Значна павялічылася колькасьць дэлегатак-калгасьніц з ліку абраных у гэтых акругах 5.548 асоб.

Гэта гаворыць за тое, што дырэктывы партыі аб узмацненьні работы ў калектыўным сэктары сельскае гаспадаркі знайшлі свае праламленьне на мясцох. Кепска, што мала, як у мінулым годы, абрана батрачак 3,8%.

У практычнай рабоце дэлегацкіх сходаў нам неабходна ўлічыць вынікі перавыбараў. Трэба паставіць работу дэлегацкіх сходаў так, каб замацаваць палітычную ролю дэлегацкіх сходаў, каб яны зьявіліся тымі організаванымі адзінкамі, якія пад кіраўніцтвам партыі выкоўваюць з работніц і бядняцка-серадняцкіх мас сялянак актыўных удзельнікаў у вырашэньні асноўных задач, стаячых зараз перад партыяй.

Дэлегацкія сходы на прадпрыемствах павінны выкаваць з дэлегатак застрэльшчыкаў сац. спаборніцтва, дэлегаткі павінны актыўна ўдзельнічаць ва ўсіх мерапрыемствах, накіраваных на ўзьняцьце працоўнай дысцыпліны, вытворчай працы, барацьбы з прагуламі, з п'янкай, астаткамі рэлігійнага дурману, з антысэмітызмам і рознага роду шовінізмам. Яны павінны дапамагчы перакоду прадпрыемства на бесьперарыўку, на 7-гадзінны рабочы дзень.

Дэлегаткі гораду павінны разгарнуць дапамогу вёсцы з боку гарадзкіх работніц. Узяць шэфства над дэлегацкім сходам у калгасе і саўгасе і дапамагчы ім літаратурай, людзкімі сіламі, сродкамі.

Дэлегацкія сходы ў калгасе і саўгасе павінны дапамагчы ўзьняць актыўнасьць калгасьніц і саўгасьніц ва ўсім жыцьці калгасаў і саўгасаў. **Справа працы, быту і жыцьця калгасу, уздым яго на вышэйшую ступень арганізацыі не павінна прайсьці міма дэлегацкага сходу. Дэлегаткі павінны першыя ўвайсьці ў ударныя брыгады і ўцягнуць туды ўсіх калгасьніц.** Дэлегаткі ў калгасах і саўгасах павінны ўцягнуць калгасьніц і саўгасьніц у актыўную работу ўнутры калгасаў, акрамя таго, самі праводзіць і іншых уцягнуць у работу па растлумачэньню бядняцка-серадняцкім масам сялянак пытаньняў калектывізацыі, знаёміць іх з жыцьцём калгасу, памагаючы ім зьнішчаць баязьнь і нерашучасьць уступленьня ў калгас.

Вясковыя дэлегацкія сходы павінны пытаньне калектывізацыі таксама паставіць у аснову адзьдзі сваёй работы. Экскурсіі ў калгасы, заслухоўваньне інфармацый калгасьніц аб іх жыцьці павінны часад-часу паўтарацца.

Асаблівую ўвагу павінны зьвярнуць д/с пытаньням падрыхтоўкі да вясеньняй сяўбы. Падрыхтоўка да вясеньняй сяўбы, мерапрыемствы па падняцьцю ўраджайнасьці, вытворчасьці працы ў калгасах і саўгасах, арганізацыя новых і ўдасканаленьне старых калгасаў, абагуленьне жывёлы, лепшая арганізацыя быту—усё гэта павінен абмеркаваць дэлегацкі сход. Ва ўсе гэтыя пытаньні павінны быць уцягнуты дэлегаткі, каб стаць актыўнымі выканаўцамі гэтых пастаноў. Ставячы так работу, мы перавядзем дэлегацкія сходы на новыя мэтады, формы работы.

З. Крэмер.

Куюцца кадры. Лабараторная праца ў тэхнікуме гумавай прамысловасьці.

Цяжкасьці пераможам

Цяжкасьці, якія мы наглядаем часьцяком, выклікаюць шэраг нездавальненьняў і размоў. Маюцца нават некаторыя адсталыя, групы сярод рабочых і вясковай беднаты, якія параўнаюць сучаснае гаспадарчае становішча з умовамі жыцьця 1918—1920 гадоў. Бязумоўна такое параўнаньне памылковае, яно супярэчыць сапраўднасьці.

Зараз наша краіна жыве бурным гаспадарчым жыцьцём. Няма ў нас ніводнай фабрыкі, заводу, якія-б не працавалі на дзьве-тры зьмены. Вельмі многія фабрыкі і заводы зараз перашлі на бесьперапынны рабочы тыдзень, гэтым павялічылі выпуск таварнай прадукцыі. Пабудованы дзесяткі новых фабрык і заводаў. Вельмі шпарка разьвіваецца сацыялістычнае будаўніцтва ў нашай краіне. Ва многіх гарадох БССР выраслі цэлыя новыя вуліцы і пасёлкі. Значна палепшыўся дабрабыт гарадоў і рабочых пасёлкаў.

На грунце гаспадарчага ўзросту нашай краіны ўзьняўся матар'яльны і культурны ўзровень рабочае клясы. Значна палепшылася становішча сельскай гаспадаркі: значна павялічылася пасяўная плошча, асабліва тэхнічных культур, бурны рост калектывізацыі сельскай гаспадаркі, рост ураджайнасьці і значнае палепшаньне матар'яльнага становішча асноўных мас сялянства.

Паўстае пытаньне: чаму-ж пры росьце ўсёй народнай гаспадаркі не хапае многіх тавараў як фабрычна-завадзкой вытворчасьці, так і прадуктаў сельскай гаспадаркі.

Гэта недастача ў асноўным выклікана бурным ростам нашае прамысловасьці, будаўніцтвам новых фабрык, заводаў, школ, рабочых пасёлкаў, жылых дамоў і гэтак далей, і адставаньнем сельскай гаспадаркі ад шпарка-ўзрастаючых запатрабаваньняў гораду і вёскі.

Правыя ўхілістыя ў нашай партыі прапанавалі зьменшыць тэмп індустрыялізацыі краіны, калектывізацыі сельскай гаспадаркі і гэтым шляхам вырашыць пытаньне аб цяжкасьцях. Гэта думка зусім памылковая, шкодная для інтарэсаў рабочае клясы і сацыялістычнага будаўніцтва; толькі праводзячы генэральную лінію партыі на індустрыялізацыю краіны, калектывізацыю сельскай гаспадаркі і наступленьне на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі мы вырашым пытаньне цяжкасьцяй.

Хлебныя затрудненьні мы пасьпяхова вырашылі толькі дзякуючы рашучаму правядзеньню лініі партыі супроць кулака і спэкулянта. Такім шляхам мы будзем вырашаць і іншыя пытаньні нашага гаспадарчага і палітычнага жыцьця.

Зараз спынімся на некаторых практычных пытаньнях здавальненьня працоўных гораду.

У гэтым годзе з хлебам у нас будзе добра, існуючая норма забясьпечваецца цалкам. Трэба толькі захаваць нарыхтаваны хлеб, палепшыць выпечку яго. На складах, у пякарнях трэба стварыць рабочы кантроль, праз рабочыя брыгады. Гэта значна дапаможа справе. У гэту работу трэяа ўцягнуць работніц і жонак рабочых—ктывістак.

Да гэтага году мы амаль зусім не займаліся адкормам жывёлы. Для бесьперабойнага здавальненьня мясам зараз ужыты крокі, якія забясьпечаць мясам рабочае насельніцтва, па ўстаноўленым нормам. У шэрагу з нарміраваньнем водпуску мяса, выдача яго толькі працоўным, праведзены шэраг мерапрыемстваў па адкорму жывёлы і сьвіней; гэта значна пашырыць мясны фонд для забясьпечаньня працоўных гораду.

Агульнае павялічэньне вытворчасьці прамысловых тавараў дае магчымасьць павялічыць здавальненьне імі на 10—12% у параўнаньні з мінулым годам. Недахоп прамтавараў у першым квартале тлумачыцца тым, што асноўная маса іх была накірована ў хлебанарыхтоўчыя раёны. З студзеня месяца павінна быць некаторае палепшаньне ў здавальненьні прамтаварамі рабочага насельніцтва.

Нашы гаспадарчыя цяжкасьці, выкліканыя ў асноўным шпаркім тэмпам росту нашае гаспадаркі, асабліва індустрыялізацыі краіны, ускладняюцца дзякуючы арганізацыйным недахопам, дзякуючы нядбайнасьці, распушчанасьці, нежаданьню некаторых працаўнікоў штодзённа змагацца з недахопамі грамадзкага жыцьця. Недапушчальным зьяўляецца тое, што пры дастатковай колькасьці недэфіцытных тавараў мы наглядаем у магазынах каапэрацыі чаргу на гэтыя тавары, наглядаем глум прадукцыі, сыравіны і гэтак далей.

Палепшаньню абслугоўваньня рабочага насельніцтва павінна дапамагчы ў першую чаргу сама работніца і жонка рабочага. Яны найбольш сустракаюцца з цяжкасьцямі, выкліканымі неарганізаванасьцю ў здавальненьні, таму работніцы і жонкі рабочых з найбольшай энэргіяй павінны ўзяцца за зьнішчэньне недахопаў абслугоўваньня працоўных гораду.

Зараз кіруючымі ворганамі распрацованы мерапрыемствы па палепшаньню абслугоўваньня спажыўца і барацьбе з чаргамі: пашырэньне крам і перавод іх на бесьперапынны рабочы тыдзень і на паўтары-дзьве зьмены, папярэдняе разьвешваньне тавараў і дастаўка іх на дом, водпуск малака па абанемэнтам і прымацаваньне да крам пайнікаў для палучэньня дэфіцытных тавараў.

Адчыненьне прадуктовых крам не пазьней 8 гадзін раніцы, устанаўленяне ў гадзіны скапленьня пайнікаў дадатковых касіраў.

Усё гэта павінна садзейніасць ліквідаваньню чаргоў у крамах. Але ў большасьці яны да гэтага часу поўнасьцю не праведзены.

Пытаньне барацьбы з чаргамі і паляпшэньня абслугоўваньня спажыўца трэба шырока абгаварыць на сходах работніц і жонак рабочых. Шырока прыўлеч для гэтай справы каапэрацыйны жаночы актыў: упаўнаважаных, дэлегатак і лаўкамісій.

Камуністычная партыя праводзіць цьвёрдую лінію на індустрыялізацыю краіны і калектывізацыю сельскай гаспадаркі. На гэтым шляху сустракаюцца цяжкасьці, якія мы павінны перамагчы, ні ў якім разе не адхіліўшыся ад генэральнай лініі партыі. Толькі гэтым шляхам мы дагонім і перагонім капіталістычныя краіны ў тэхніка-эканамічных адносінах і паставім Савецкі Саюз у першых шэрагах найбольш індустрыялізаваных краін. На шляхам уступах і згод з кулаком і нэпманам, як гэта прапануюць правыя ўхілістыя, а шляхам энэргічнага, рашучага наступу на іх мы пераможым цяжкасьці, якія зараз маюцца, і паднімаем на высокі матар'яльны і культурны ўзровень жыцьцё працоўных нашай краіны.

Бэнэк.

Каляды патрэбны толькі клясавым ворагам працоўных мас.

За гэтыя гады мы маем не малыя посьпехі на фронце барацьбы з рэлігійным дурманам. Перадавыя пласты працоўных мас усё больш усьведамляюць, што рэлігійнасьць перашкаджае больш шырокаму ўдзелу рабочых і ўсіх працоўных мас у сацыялістычным будаўніцтве.

Працоўныя масы скідаюць з сябе рэлігійныя путы: адмаўляюцца ад рэлігійных сьвят, абрадаў, выкід-



Званы ў фонд індустрыялізацыі.

ваюць іконы, залатыя крыжыкі—здаюць на абарону краіны; цэрквы, сінагогі, касьцёлы—ператвараюць у клюбы, школы, дзіцячыя дамы.

Але побач з гэтым у адсталай частцы насельніцтва яшчэ трымаецца вякамі насаджваемая рэлігійнасьць, з якою яшчэ больш рашуча трэба змагацца перадавым рабочым, усім сьвядомым працоўным.

Папы і сэктанты ўсіх колёраў адчуваюць сваю гібель, разам з гібеллю рэлігійнасьці. Яны шукаюць глебу, за якую-б можна ўчапіцца. Гэту глебу яны шукаюць сярод адсталых няпісьменных, адарваных ад грамадзка-палітычнага жыцьця людзей. А такімі часьцей зьяўляюцца жанчыны, якіх бытавыя ўмовы зрабілі больш адсталымі. Таму папы, равіны, ксяндзы і сэктанты ўпарта змагаюцца за ўплыў на адсталыя жаночыя масы.

Мы маем шэраг прыкладаў, калі па ініцыятыве работніц царква перадана пад дзіцячы сад, так, напрыклад, нядаўна было ў Віцебску.

Пры справаздачы саветаў работніцы, жонкі рабочых і працоўныя сялянкі патрабавалі ад саветаў адабраньня царквы, сінагогі, касьцёлу пад культурныя ўстановы.

Але ўсё-ж у рэлігійных арганізацыях у сучасны момант жанчыны складаюць 80%. Вось чаму ахапіць антырэлігійнаю работаю жаночыя масы працоўных зьяўляецца важнейшаю задачаю ў барацьбе з рэлігіяй. Жанчына мае вялікі уплыў на выхаваньне дзіцяці. Без змаганьня з рэлігіяй сярод жанчын мы ня будзем мець безрэлігійнае пакаленьне.

Для змаганьня з надыходзячым рэлігійным сьвятам „каляды“ работніцы і сялянкі перш за ўсё павінны разумець клясавую сутнасьць гэтага сьвята. Сьвята гэта, як і наогул хрысьціянская рэлігія, вучыць, што ўсе людзі браты, што трэба любіць сваіх ворагаў, а значыцца і не змагацца з імі.

Таму работніца і сялянка, якая сьвяткуе каляды, павінна любіць спэкулянта і кулака, а ў буржуазных краінах рэлігія патрабуе ад рабочых і сялян любві к памешчыкам і капіталістым і гэтым самым забараняе ім вясьці клясавую барацьбу. Зразумела, што такое вучэньне карысна буржуазіі, а ў нас нэпманам, папам і кулакам,—і шкодна для працоўных.

Усім вядома, што ў 1918 годзе царква праклята працоўных за тое, што яны скінулы памешчыкаў і капіталістых і ўзялі ўладу ў свае рукі.

Цяпер паглядзім, ці быў такі хрыстос, нараджэньне якога сьвяткуюць веруючыя кожны год?

Няма ніякіх дакумэнтаў, якія-б сьведчылі аб гэтым. Эвангельскія-ж апавяданьні аб нараджэньні хрыста зьяўляюцца нічым іншым, як байкамі. З гэтым згодны ўжо і некаторыя буржуазныя вучоныя, як, напрыклад, прафэсар багаслоўя Берлінскага універсытэту Дрэва, які напісаў кніжку пад назвай „Байка аб хрысьце“. На самай справе, нічым іншым, як байкай трэба назваць усе апавяданьні аб хрысьце ў эвангеліі. Эвангеліе кажа, што хрыстос нарадзіўся ад маткі бяз удзелу мужчыны, што дух быў прычынаю нараджэньня хрыста. Два эвангелістыя—Матвей у першай главе, а Лука ў трэцяй прыводзяць сьпісы продкаў; адзін ад Абрама, а другі ад Адама, прычым Матвей налічвае продкаў хрыста ад Давіда да Іосіфа 28, а Лука цэлых 42; Матвей кажа, што дзедам хрыста быў Якаў, а Лука кажа, што дзед хрыста называецца Ілія.

У эвангелія, ёсьць шмат недарэчных апавяданьняў аб хрысьце. Гэтыя байкі аб хрысьце вельмі падобны да тых баек, якія існавалі ў старажытных народаў больш тысячы гадоў да паяўленьня хрысьціянства. Так, пра індускага бога Буду сказана, што яго матка Майя зрабілася цяжарнаю ад праменьняў зьвязды, што ў Буды было 12 вучняў і што ён пасьціўся ў пустыні 40 дзён і тады вазьнёсься на неба. Падабенства апавяданьняў аб хрысьце з апавяданьнямі аб Будзе сьведчыць аб тым, што эвангельскія байкі аб хрысьце сьпісаны з баек аб Будзе. Такім чынам атрымліваецца вось што: веруючыя сьвяткуюць ражаство ніколі не нараджаўшагася хрыста.

Надыходзячае сьвята каляды з асабліваю вастратою ставіць пытаньне аб пашырэньні і паглыбленьні антырэлігійнае прапаганды сярод работніц і сялянак.

Антырэлігійны гурток саюзу Нархарчаваньня (г. Менск).

Падзеі апошніх месяцаў паказалі, што ў розных канцох СССР раскрыты шэраг контррэвалюцыйных арганізацый папоў і сэктантаў, якія, прыкрываючыся рэлігіяй, праводзяць сваю ганебную справу.

Барацьба з рэлігіяй ёсьць адна з важнейшых вучасткаў у барацьбе на палітычным і гаспадарчым фронце ў горадзе і вёсцы.

Зараз праводзіцца ў жыцьцё бесьперапынны працоўны тыдзень. Жаночы актыў павінен разгарнуць максімальную работу па падрыхтоўцы і правядзеньні ў жыцьцё бесьперапыннага тыдню. Гэтага патрабуюць задачы павялічэньня вытворчасьці. насышчэньня рынку прамысловымі таварамі. Бесьперапыннага тыдню патрабуюць інтарэсы зьнішчэньня нацыянальнае варожасьці, якая падтрымлівалася наяўнасьцю магаметанскіх пятніц, юдзейскіх субот, хрысьціянскіх васкрасеньняў. Абменьваючы гэтыя дні, мы б'ем па абрадавым боку рэлігіі.

Папы, кулакі і нэпманы ўжо палохаюць тым, што бесьперапынны тыдзень адрывае мужа ад жаны, прымушаных адпачываць у розныя дні. Трэба дабівацца, каб работнікі, у якіх маюцца другія члены сям'і, працуючыя, мелі магчывасьць выбіраць сабе дні адпачынку.

Ужо некалькі месяцаў таму назад рабочыя розных прадпрыемстваў падалі ініцыятыву аб тым, каб рэлігійнае сьвята каляды зрабіць рабочымі днямі і абвясьціць днямі індустрыялізацыі. Праводзімая цяпер антыкалядная кампанія павінна ажыцьцявіць гэтую ініцыятыву. Ні адна працоўная жанчына не павінна сьвяткаваць каляд.

Нельга не застанавіцца на бытавой шкоднасьці рэлігійных сьвят, якую яны нясуць за сабою, у асабліваснці гэта трэба сказаць адносна сьвят каляды, якое пачынаецца з 25 сьнежня і цягнецца да 7 студзеня.

Царква заўсёды падтрымлівала п'янства. Сярод розных прадуктаў, які сьвенцяць веруючыя ў рэлігійныя сьвяты, заўсёды свенціцца і гарэлка. Веруючыя прыносяць папам гарэлку, калі хрысьцяць дзяцей ці жэняцца.

Каляды, як і ўсе рэлігійныя сьвяты, патрэбны капіталістым, царкоўнікам, нэпманам, кулакам—нашым клясавым ворагам—вось што павінна ведаць кожная работніца, батрачка і ўсе працоўныя жанчыны.

Даўгаполаў.



Царква в. Насавічы, узятая пад клюб.

Цэрквы, сінагогі, касьцёлы—пад культасьветныя ўстановы.

Царкву пад клюб.

У вёсцы Насовічах агульны сход сялян 17 X—29 г. пастанавіў перадаць царкву пад клюб калгасу.

6 лістапада адбылося адчыненьне новага клюбу. Увечары загудзеў устаноўлены гучнагаварыцель, зайграў духавы аркестр. Сабралося народу ў клюбе як ніколі ў царкву ня зьбіраліся—моладзь і старыя.

— Будзем жыць па-новаму, прагонім ад сябе дурман-рэлігію,—казалі беднякі і сераднякі.

Зараз у новым клюбе многа адбылося сходаў, вечароў.

Калінкавічы, Мазырск. акр. **С. Л. М.**

Царкву—пад школу калгасу.

У вёсцы Насовічах арганізаваны калгас з ліку 200 сямей, акрамя гэтага кожны дзень паступаюць заявы аб прыёме новых сябраў.

Пастановай агульнага бядняцка-серадняцкага сходу сялян, дзе прысутнічала шмат жанчын, аднагалосна царкву перадалі пад клюб, дзе зараз ужо ўстаноўлена радыё, пабудавалі парты і рыхтуюцца да адчыненьня клюбу.

Жанчыны гэтай-жа вёскі аднагалосна парашылі ў новым клюбе ліквідаваць сваю няпісьменнасьць, разгарнуць культмасавую працу.

Коцік.

Замест царквы ясьлі.

У вёсцы Клінок, Чэрвеньскага раёну жанчыны пастанавілі адчыніць ясьлі на самаабкладаньні. Мужчыны спачатку супярэчылі, але сялянкі перамаглі. Сельсавет і РВК таксама пайшлі ім насустрач.

Адначасова на сходзе сялян было вырашана пытаньне аб перадачы царквы пад ясьлі. Поп ужо ўцякае з гэтай вёскі, бо яму няма прыбытку.

А сялянкі цяпер кажуць, што іх правадыр—камуністычная партыя, якая дапамагла будаваць новае жыцьцё, папу больш ня ўдасца іх ашукваць.

Чэрвень, Менскай акр. **Таўкачова.**

РЫХТУЙЦЕСЯ ДА ВУЧОБЫ.

Рост сацыялістычнага будаўніцтва патрабуе значнай падрыхтоўкі кіруючых кадраў для прамысловасьці, сельскай гаспадаркі з рабочых батракоў і працоўных сялян. Гэтыя кадры падрыхтоўваюцца праз вышэйшыя навучальныя ўстановы, рабфакі і тэхнікумы.

Да гэтага часу ў нашых вузах і тэхнікумах навучаецца яшчэ зусім мала работніц, батрачак і працоўных сялянак. Вучобе работніц перашкаджае слабая пісьменнасьць і наогул недастатковая падрыхтоўка.

За вучобаю.

У гэтым годзе прымаюцца меры, каб сваечасова падрыхтаваць для навучальных устаноў кадры рабочых, работніц, батрацтва і працоўнага сялянства.

Наркамасьветы сумесна з Цэнтральным Саветам Прафсаюзаў зараз арганізуе ў розных акругах курсы па падрыхтоўцы ў вузы і тэхнікумы.

Так арганізуецца:

1) Курсы па падрыхтоўцы ў вузы для рабочых: у **Віцебску** пры вячэрнім рабфаку на 100 чалавек,
2) у **Гомелі** пры вячэрнім рабфаку на 100 чалавек,
3) у **Барысаве** пры вячэрнім рабфаку на 100 чал.,
4) у **Магілеве** пры палітасьветтэхнікуме на 50 чалавек.

Курсы разьлічаны на год, працуюць па вечарох; прымаюцца на іх будуць маючыя веды за 7-годку.

На курсах павінна быць ня менш 35% работніц.

Адначасова адчыняюцца гадзічныя вячэрнія курсы па падрыхтоўцы ў тэхнікумы для рабочых, работніц і дзяцей рабочых: **у Менску, Гомелі, Віцебску, на Дзьвіне, Барысаве, Магілеве, Бабруйску і Рэчыцы.** На гэтыя курсы таксама будзе прынята 35% работніц, а ў Барысаве, Рэчыцы і на Дзьвіне—60% работніц.

Спэцыяльныя курсы арганізуюцца для падрыхтоўкі батрачак, калгасьніц і саўгасьніц у сельскагаспадарчыя тэхнікумы. Для паступленьня ў іх трэба веды за 4—5 груп школы. Камандыруемыя на гэтыя курсы будуць палучаць стыпэндыю і аслабаняцца ад работы.

Курсы будуць займацца на працягу году.

Для падрыхтоўкі ў ВНУ батракоў, калгасьнікаў і беднякоў ствараюцца гадзічныя курсы на 250 чалавек, на якіх таксама павінна быць ня менш 35% жанчын.

Усе гэтыя курсы дадуць магчымасьць прадвінуць работніцу на вучобу. Партыйныя, прафэсыянальныя арганізацыі павінны прыняць меры, каб паслаць большы лік работніц.

Аб арганізацыі курсаў павінны ведаць усе работніцы, батрачкі і калгасьніцы. Праз вучобу работніцы і батрачкі падрыхтуюцца для кіруючай работы.

25 сьнежня ўсе работніцы к варштатам.

Залаты крыж—у фонд індустрыялізацыі.

Разглядзеўшы выклік работніц і жонак рабочых шчаціннае фабрыкі, аб здачы залатых рэчаў у фонд індустрыялізацыі краіны, дэлегаткі заводу „Бальшавік“ парашылі: „Здаць маючыяся ў дэлегатак залатыя рэчы ў фонд індустрыялізацыі“.

Дэлегаткі, у якіх няма залатых рэчаў, уносяць сродкі грашыма, ці адрабляюць на прадпрыемстве дзень у фонд індустрыялізацыі.

Мы выклікаем пасьледаваць нашаму прыкладу ўсіх работніц і жонак рабочых нашага заводу, а таксама дэлегацкі сход, работніц і жон рабочых заводаў: „Энэргія,“ Чырвоная Зара“, „Сьпіртазавод“.

Страйчанская.

Іконы на падпал.

Шэсьцьдзесят год пражылі дзед Мікіта з сваёю бабулькаю Палагеяй, маліліся, білі паклоны, ці мала дабра перацягалі ў царкву за ўсе гады.

Зараз яны вызваліліся ад дурману—першымі галасавалі за перадачу царквы пад клюб.

Палагея і Мікіта адмовіліся ад багоў.

— Годзі нас дурманілі, акалпачвалі—заявілі старыя.

Назаўтра яны спалілі іконы і ўпрыгожылі хату партрэтамі правадыроў.

Па іх прыкладу хату—хто расквітаўся з багамі. **С. М. Л.**

Калінкавічы, Мазырскай акр.

Мы працуем на каляды.

Рабочыя шклозаводу „Кастрычнік“ вынесьлі пастанову 25 сьнежня (рэлігійнае сьвята—каляды) працаваць на прадпрыемстве ў карысьць індустрыялізацыі краіны.

Абгаварыўшы гэта пытаньне, жонкі рабочых парашалі не адставаць ад мужоў і сясьцёр, таксама адпрацаваць гэты дзень на прадпрыемстве ў карысьць індустрыялізацыі краіны. **Казіміроўская.**

Дзевяноста шэсьць

Тут раскацісты гул станкоў не аглушае ўпяршыню зайшоўшага чалавека, у вочы яму ня кідаецца пераплеценьне прывадных рамней. Ціха. Калыхаецца лёгкае воблака дыму. У гэтай цішыні з упарствам акунуўшыся ў работу рабочымі ажыцьцяўляецца на практыцы вялікая справа—сацыялістычнае спаборніцтва.

Тут яно зарадзілася. Але ў тыя дні ня было гэтакай цішыні. Было шумна, лаянка, песьні і гоман раскаціста гучэлі ў гэтых сьценах...

...Узялася за арганізацыю ўдарнай брыгады Круглікава. Сшывальшчыцы пасьмейваліся.

— Якое там спаборніцтва, калі мы заўтра на біржу пойдзем,—гаварылі яны ў адказ на прапанову Круглікавай уступіць у брыгаду. Але Круглікава цьвёрда, яна працягвае свае справы. Хутка ёй у дапамогу прышла Сасонкіна. Разам праца пашла байчэй. А тут яшчэ чуткі пайшлі, нібы фабрыка з-пад загаду працкалектываў пераходзіць у дзяржаўную прамысловасьць.

Ажывіўся фабком, рабкоры—адчувалася дапамога. У зачыншчыц больш энэргіі, упэўненасьці. Ды і самі работніцы ажывіліся, больш уважліва прыслухоўваліся да закліку „зацейшчыц". Сацыялістычнае спаборніцтва наладжвалася.

Адна за другой уступалі ў ударныя брыгады сшывальшчыцы. У канцы жніўня ў брыгадзе 30 чал. А зараз брыгадай ахоплена 96.

Дзевяноста шэсьць! Яны ператварылі цэх у адзіную ўдарную брыгаду, яны ўзьнялі вытворчасьць, зьнізілі сабекаштоўнасьць, дамагліся таго, што ні адна годная шчацініна, ні адна галінка рысу ня гіне дарма.

Дзевяноста шэсьць! Яны сталі прыкладам для усёй фабрыкі. Аб іх з вялікай пашанай гавораць рабочыя астатніх цахоў. Аб іх пішам і мы, а працуюць яны ў сшывальным цаху на Менскай шчотачнай фабрыцы імя „Крупскай".

Упартай энэргічнай працай.

У астатніх цахах фабрыкі сацспаборніцтва пачало разгортвацца пасьля сшывальшчыц. Групы работніц падалі заявы аб павышэньні нормы выпрацоўкі. Першым пасьля сшывальнага цэху ідзе аддзелачны цэх. Невялічкая група работніц падала заяву з просьбаю павялічыць норму, а пасьля работніцы Піліповіч і Ушакова ўзяліся за арганізацыю ўдарнай брыгады. Ім ужо было лягчэй,—вопыт быў. Цэх стаў непазнаваемым. У мінулым гэта быў цэх, у якім работніцы найчасьцей мелі вымовы,—самы адсталы цэх. Бойкі, плёткі, лаянка—вось мінулае аддзелачнага цэху. А зараз бойка працуе брыгада з 48 чал. Шпарка, крутчэй бегаюць рукі, весялей выглядзіць аддзелачны.

Жнівень і верасень—два першых месяца сацспаборніцтва далі зьніжэньне прагулаў па ўсёй фабрыцы на 34 проц., павышэньне вытворчасьці на 4,9 проц., памяншэньне браку на 34 проц. Дабраахвотнае павялічэньне норм за гэты-ж час дало эканомію 643 р. 94 кап. Супроць гэтых лічб не папрэш, гэтыя лічбы не абвергнеш. Яны дасягнуты ўпартай працай, творчай энэргіяй рабочых.

З працкалектыву ў фабрыку.

З першага кастрычніка шчотачны працкалектыў сапраўды ператварыўся ў фабрыку. Мары рабочых і работніц збыліся. Зараз, не палохае зьмяняемасьць, рабочыя стала замацованы на фабрыцы, таму яшчэ з большай энэргіяй узяліся за сацспаборніцтва.

Бураўшчыкі, каніфольшчыкі, токары, сартаўшчыкі—усе ад вучня да майстра ўступілі ў сацспаборніцтва; адзін за другім цэлыя цэхі павышалі норму выработкі. Рабочыя выклікалі адзін аднаго на індывідуальнае спаборніцтва.

Работніцы ткацкай фабрыкі парашылі разьмяркоўваць заработак незалежна ад кваліфікацыі.

У кастрычніку вытворчасьць працы ўзьнялася на 5,8 проц., ад павышэньня нормы з'эканомлена 278 р. 90 кап., прагулы зьнізіліся на 6 проц.

З 640 рабочых шчотачнікаў—458 работніц. Звыш 300 работніц удзельнічаюць у сацспаборніцтве. Работніцы—зачыншчыкі, арганізатары сацспаборніцтва. Яны праводзілі і праводзяць вялікую работу, каб ператварыць усю шчотачную фабрыку ў ударную фабрыку. Работніцы—для многіх прыклад.

І, ня гледзячы на гэта, на фабрыцы амаль няма вылучэнак. У фабрычных партыйных, прафэсыянальных арганізацыях, на кіруючай рабоце ўсюды мужчыны. І гэта ў той час, калі сама фабрыка ў большасьці „жаночая".

З вылучэньнем на шчотачнай фабрыцы кепска. А вылучаць ёсьць каго. Сацыялістычнае спаборніцтва выразна паказала дзесяткі лепшых кандыдатур, якія могуць быць вылучаны, здольны кіраваць. Аб гэтым шчотачнікам трэба падумаць, за гэту справу безадкладна ўзяцца.

Трэба падцягнуцца і тэхнічнаму персаналу фабрыкі. Стаяць з боку ад такой вялікай справы—нельга.

А заводакіраўніцтву рана яшчэ „адпачываць супакоенага". Прадпрыемства маладое, патрабуе шэрагу арганізацыйных замацаваньняў, зьнішчэньня няўрадзіц.

Трэба часьцей інфарміраваць работніц і рабочых аб дасягненьнях на фронце сацыялістычнага спаборніцтва.

С. Ков.

ПРАВЕРКА САЦДАГАВОРАУ

„Сацыялізм ня толькі ня гасіць спаборніцтва, а, наадварот, упяршыню ствараe магчымасьць ужыць яго сапраўды шырока, сапраўды ў масавым разьмеры, уцягнуць сапраўды большасьць працоўных на арэну такой работы, дзе яны могуць праявіць сябе, разгарнуць свае здольнасьці, праявіць таленты, якіх у людзей—непачатая крыніца і якія капіталізм мяў, душыў тысячамі і мільёнамі“.

ЛЕНІН.

У лістападзе скончылася масавая праверка дагавароў па сацыялістычнаму спаборніцтву. Праверку праводзілі шырокія масы рабочых і работніц. Па 56 прадпрыемствах Беларусі, на якіх працуюць 39848 рабочых, было арганізавана 405 рабочых брыгад па праверцы, у якія было ўцягнута 3152 брыгадыры, з іх 882 работніцы.

На 45 прадпрыемствах выбіраліся часовыя кантрольныя камісіі, у іх удзельнічала 315 рабочых і работніц.

Для арганізацыі працы па праверцы былі мабілізаваны ўсе прафпрацаўнікі, апрача гэтага з Масквы выехала брыгада УсеЦСПС, на чале якой стаяла работніца-вылучэнка тав. Бабушкіна.

Рабочыя брыгады выбіраліся на сходах рабочых, а потым да іх далучаліся дабраахвотнікі з рабочых і работніц, а таксама дэлегаткі работніцы і жонкі рабочых. Так, у Рэчыцы 120 дэлегатак прынялі актыўны ўдзел у праверцы сацыялістычных дагавароў.

Брыгады вывучалі, як ажыццяўляюцца дагаворы па сац. спаборніцтву, выяўлялі ўсе перашкоды, якія маюцца ў справе правядзеньня спаборніцтва і потым паведамлялі аб гэтым рабочых на сходах, канфэрэнцыях і вечарох.

Беларуская дэлегацыя на ўсесаюзны зьезд ударных брыгад.

Што паказала праверка.

Праверка паказала значны ўздым працоўнага энтузіязму. Так, на папяровай фабрыцы „Гэрой Працы“ (Добруш), на сярнікавай фабрыцы „Чырвоная Бярэзіна“ і ў шмат іншых прадпрыемствах наглядаюцца значна лепшыя адносіны работніц і рабочых да варштагаў, машын і наогул да вытворчасьці.

На скураным заводзе „Бальшавік“ (Менск) 202 рабочых дабраахвотна зьнізілі расцэнкі, на заводзе „Камунар“ (Менск) дабраахвотна зьнізілі расцэнкі 250 чалавек.

Такія адносіны да вытворчасьці мелі месца ў цэлым шэрагу прадпрыемстваў. Рабочыя і работніцы ўнесьлі шмат прапаноў аб палепшаньні працы, аб больш эканомным выдаткаваньні сырцу і апалу, што зьберагло дзяржаве шмат грошай, якія пойдуць на палепшаньне вытворчасьці, на закупку машын, на палепшаньне быту рабочых і работніц.

Так, на фабрыцы „Дзьвіна“ (Віцебск) па прапанове работніц палепшана скарыстаньне сырцу (ільну), у выніку чаго меншая частка яго прападае і гэта дало эканоміі за 3 месяцы 47.000 рублёў. Па прапанове рабочых перароблены топкі ў фабрычных катлох і гэта дае эканоміі ў 110000 рублёў.

На будаўнічых працах ў Менску, пры пастройцы клінічнага гарадку, па прапановах рабочых маецца эканоміі ў 53000 рублёў.

Тыя абавязкі, якія ўзялі на сябе рабочыя і работніцы па поўнаму выкананьню вытворчых плянаў, у большасьці прадпрыемстваў выкананы з правышэньнем.

Некалькі горш выкананы абавязацельствы па зьнiжэньню сабекаштоўнасьці, па палепшаньню якасьці і па зьмяншэньні глуму. Праўда, маюцца дасягненьні і ў гэтых галінах, але не настолькі, наколькі ўзяліся рабочыя пры падпісаньні сацыялістычных дагавароў.

Некаторая **частка** больш **адсталых** рабочых і работніц ня прымаюць удзелу ў сацспаборніцтве, апрача гэтага, у асобных прадпрыемствах улезьлі пад відам рабочых асобныя кулакі і падкулачнікі, якія спрабуюць адцягнуць рабочых ад удзелу ў сацыялістычным спаборніцтве.

Асабліва такія зьявішчы наглядаліся на сернікавай фабрыцы „Днепр“ і „Х Кастрычнік“ у Рэчыцы, на тэкстыльнай фабрыцы „Дзьвіна“ ў Віцебску і ў некаторых іншых прадпрыемствах.

Асабліва важную ролю ў справе правядзеньня сацспаборніцтва занялі ўдарныя брыгады, якія паказвалі прыклад усім рабочым, як трэба працаваць, хаця з пачатку іх было мала.

Так, па 42 прадпрыемствах, на якіх працуюць 33873 рабочых, налічвалася 66 ударных брыгад, куды ўваходзілі 1036 ударнікаў, што складала ўсяго 3 проц. да ўсіх рабочых. За час праверкі колькасьць ударных брыгад і ўдарнікаў значна вырасла.

Па гэтых-жа прадпрыемствах пасьля праверкі існавала 366 ударных брыгад, ударных зьмен і цахоў з агульнай колькасьцю ўдарнікаў у 4976 чалавек.

Зьезды ўдарнікаў, якія праводзіліся па ўсіх акругах, значна павялічылі актыўнасьць рабочых і работніц, і колькасьць ударнікаў і ўдарніц яшчэ больш вырасла.

Маецца ўжо першае ўдарнае прадпрыемства—Менскі хлебазавод, які па жаданьню ўсіх рабочых гэтага заводу, абавясьціў сябе ўдарным.

Што перашкаджае сацспаборніцтву.

Праверка выявіла, што ў справе разгортваньня спаборніцтва ініцыятыва рабочых часта затрымлівалася з-за бюрократычных адносін асобных гаспадарнікаў і з-за недаацэнкі сацспаборніцтва шэрагам прафсаюзных арганізацый.

Так, напрыклад, калі 5 рабочых Гомельскіх чыгуначных майстэрняў падалі заявы аб дабраахвотным зьніжэньні расцэнак, адміністрацыя трымала гэтую заяву 2 месяцы, а потым згубіла.

Калі група работніц выклікала другую групу работніц на сацспаборніцтва праз Віцебскі МК Цягі (на чыгунцы ў Віцебску), дык мясцком, не запытаўшыся ў тых работніц, адказаў за іх, што яны ад гэтага выкліку адмаўляюцца.

Маецца шмат выпадкаў, калі каштоўныя прапановы рабочых ня выконваюцца. Так, на Мазырскім фанэрным заводзе „Чырвоны Кастрычнік" адміністрацыя ігнарыруе прапановы рабочых і самавольна адмяняе пастановы вытворчых нарад.

У вагонных майстэрнях (Менск) прапанова ўдарнікаў аб скарыстаньні старых машынных частак і матар'ялаў пакінуты без усялякай увагі. Такіх выпадкаў маецца шмат: па ўсіх прадпрыемствах.

Пры праверцы ўсё гэтае было выяўлена—шэраг гаспадарнікаў прыцягнута да адказнасьці і некаторыя нават зьняты з працы.

Прафсаюзы зусім мала прыстасавалі сваю культпрацу да растлумачэньня задач сацспаборніцтва; шмат клюбаў амаль што не займаліся гэтай працай.

Дрэнна было наладжана прэміраваньне рабочых і работніц за лепшыя прапановы і за лепшы ўдзел у сацспаборніцтве. Праверка выявіла гэтае, і пасьля па большасьці прадпрыемстваў прэміі пачалі выдаваць.

Шмат рабочых атрымлівалі экскурсіі ў лепшыя прадпрыемствы, радыё-прыёмнікі, перавод на вышэйшую кваліфікацыю і гэтак далей.

Праверка выкананьня дагавароў па сацспаборніцтву ўліла дзесяткі тысяч рабочых і работніц у перадавыя рады сацыялістычнага спаборніцтва ў ударныя брыгады, выявіла перашкоды, якія маюцца ў справе правядзеньня спаборніцтва і мабілізавала ўвагу ўсіх фабрычна-завадзкіх арганізацый і шырокіх мас рабочых на неабходнасьць зжыцьця гэтых прапаноў.

Усё гэтае дае магчымасьць у далейшым яшчэ больш разгарнуць сацспаборніцтва, перанесьці яго ў цэхі, у зьмены, на асобныя варштаты, перанесьці вопыт спаборніцтва з прадпрыемстваў, у вёску, у калгасы і таварыствы.

Гэта дасьць поўную магчымасьць і з перавышэньнем выканаць 5-гадовы плян, які зараз ажыцьцяўляецца ўсёй рабочай клясай пад кіраўніцтвам партыі.

Работніцы, будзьце ў першых шэрагах сацспаборніцтва, у ўдарных брыгадах, у ўдарных цэхах і фабрыках, гэтым вы дапаможаце хутчэйшай пабудове сацыялізму ў нашай краіне.

Менск, ЦСПСБ. **М. Шап.**

РАБКОРКІ ПІШУЦЬ.

Карамельшчыцы наперадзе.

Да апошніх гадоў жаночая праца ў карамельным цэху зусім ня ўжывалася. Нават, калі было ўзьнята пытаньне аб пасылцы ў бронь дзяўчат, многія лічылі, што ня змогуць працаваць дзяўчаты ў карамельным цэху. А цяпер работніца заваявала сабе мейсца ў карамельным.

Праверка сацыялістычных умоў паказала, што карамельшчыкі выканалі ўзяты на сябе абавязак. Арганізавалася некалькі брыгад у цэху, адна выключна жаночая: майстар Тайц, падмайсьцеры—Мерсон, падручная—Фейгельман, вучаніца—Зінькова.

З моманту заключэньня сацдагавору брыгады зьнізілі брак да 1,1 проц. (па ўмове было 2 проц.), вытворчасьць працы паднялася звыш 50 проц.

Прагулы па няўважлівых прычынах раней былі 4—5 проц., а зараз толькі 1,01 проц.

Нормы паднялі ўдарнікі на 12 проц., а жаночая брыгада т-ша Тайц падняла норму на 15 проц.

Гэта падцягнула і астатніх.

— Далучаемся да норм жаночай брыгады—заявілі яны.

Прыкладнай зьяўляецца ў вытворчасьці жаночая брыгада: чыстата, высокая дысцыпліна. У апошні дзень яны зрабілі 413 кілё барбарысных цукерак, тады, як астатнія рабілі да 350 кілё. За актыўны ўдзел у падняцьці вытворчасьці жаночая брыгада прэміравана.

Таксама прэмію—радыё атрымала і работніца варачнага цэху таварыш Шыманоўская Маша. 15 год яна працуе на розных прадпрыемствах. Зараз яна адна вырабляе 150 кілё тавару там, дзе раней стаяла 2 рабочых і выпускалі толькі 70 кілё.

Брыгада т. Тайц.

Таварыш Шыманоўская дабраахвотна падняла норму на 10 проц.

Фабрыка „Прагрэс", Менск. **М. Г.**

Абгаварваем непрарыўку.

Распрацоўваючы пытаньне аб пераходзе на бесьперапынны рабочы тыдзень, работніцы фабрыкі „Прагрэс" адобрылі гэта мерапрыемства.

Пераход на непрарыўку дасьць магчымасьць выканаць пяцігадовы плян у 4 гады. Павялічыцца вытворчасьць працы рабочых.

Агульныя непрацоўныя дні будуць інтэрнацыянальным сьвятам для ўсіх рабочых. Пагэтаму непрарыўны рабочы тыдзень дасьць карысьць і дзяржаве і рабочым. Але для таго, каб гэты пераход быў безбалючым, трэба перавесьці на бесьперапынны тыдзень таксама і дзіцячыя ўстановы, ясьлі, дзіцячыя сады, ачагі.

У сьнежні фабрыка пераходзіць на непрарыўку. Дэлегаткі парашылі ўзьняць перад гарсаветам пытаньне аб пераводзе на бесьперапынны рабочы тыдзень дзіцячыя ўстановы.

Група дэлегатак.

ПЯЧАТКА

Апавяданьне ГАЛКІ

малюнкі ВАЛО

Плакучыя бярозы косы растрапалі, кучаравыя косы. Каткі кудлаценькія паўплецены ў іх.

Каткі на бярозах—разьведчыкі вясны, красавіцкі падарунак сонца.

У лагчыне, пад зялёнымі, разнымі лапкамі, зорачкі курасьлепу галоўкі пазадзіралі, да сонца цягнуцца. У цяні плямы сьнегу, наздрастыя, бы цукар падмочаны.

Апошнія патугі змаганьня зімы з вясною.

Старыя бярозы вартаўніча хмурацца, шлях з двух бакоў ачапілі, бягуць далёка, далёка, хаваюцца за краявідам.

Гразка. Дарога кулеш-куляшом. То сюд, то туд—вазы калываюцца, па вось засмактала іх. Сьпіцы кола лапаціць тлусты кулеш. Тужыцца каняка, бы п'яная хістаецца на грудок узьлезшы. Вунь, бачыце, нечы воз мінуў грэблю. Кола ўчапіла папліску; тая закрактала, вагнулася, зшурпаціў адапрэлую кару, вырвалася, з разгону ляснуўшы па калюжы, грязёю закідала падарожнікаў.

І ўсё такі лепш у вазу, на сене.

Арына-ж на бацькаўскай пары пехатурыць. Беражком пасоўваецца яна: з карча на корч, праз разоры, калюжы скача. Ад шпаркае хады млосьць разьлілася па целу. Рукою пот з твару ўцірае.

— Ух, замарылася.

А ў кішэні, бы сакавітая, восеньская капуста, хрустае паперка.

— Ах, ах, мяне выправілі, ад усей грамады з даручэньнем. У людзі, значыцца... Пакуль - што сюды, а там... Хто яго ведае.

. . . . . .

Вось, стол даўжэнны, чырвоным засланы. За сталом акулярысты і тут, побач Арына, раз-по-разу ваду з шклянкі гранёнае глынае, і гаворыць, з запалам дакладвае. Усе вочы вылупілі, а на яе няма палахлівасьці: рэжа пра ўсё, як ёсьць, бяз утайкі, і пра Зьмітрыка і пра самаго старшыню.

— Ай, да Арына, бой—акулярысты хваліць, асалодай поіць прагнае нутро Арына.

Вось дык жонка ў Пракопа—гэта сусед заўважыў.

. . . . . .

І сапраўды, апошні раз у савет дакладаю. Людзі падпісалі, не я адна. Ня зробяць нічога—так і знай—махнідрала. Тады інакш пашукаем канцоў, у якой вадзе яны схованы.

А Тадорык, за што гэта? Сымона выправіць хацеў. Людзі за мяне, а ён...

— Куды выбралася, на ноч глядзя?—букнуў сусед і не дачакаўшыся адказу ляснуў па каню ляйчынаю, мінуў маладзіцу.

— Сапраўды вечар на двары—разважае Арына. — Тарабаніць хтось, папрасіцца падвезьці, ці што?

Калі каламажка Базыля параўнялася, Арына нават рот разьзявіла, намерылася на воз прасіцца. Але той і дзендобры не сказаў,—паехаў.

— Хай прэцца. Абыйдземся і бяз ягонай ласкі,—падумала Арына, і ўспомніла, што ў заяве ўспамінаюць і Зьмітрыка, Базылёвага брата. Яшчэ як успамінаюць, што зямлю ўтаіў.

— Ці будзе што? Хіба ня ведаюць?—разважае маладзіца. Яны то ведаюць. Сама я не ўяўляю: разумнейшая ад усіх, ці дурнейшая; на гару лезу, ці ў пелю скачу? Маўчаць людзі, не я адна...

Нешта горкае па нутру разьлілася, атруціла нутро. А пасьля зьбегшыся ў адзін рапяжок, сэрца так нудна пачало казытаць.

— А што ён мне? Падаткам не абкладуць, маё багацьце вядомае. Пеўня чырвонага пабаіцца, гад, пусьціць—заспакойвае сябе Арына, націскае на пяту, крочыць шырэй.

Узышла на грудок, абіла гразь з чабот, трэскаю абскрабваць пачала, калупнула падашву і застыла. Мужавы боты зубы вышчарылі. Арыну сьляза туманіць, а бот з нагі пазірае і так нагла сьмяецца. Сюд-туд нагою пакруціла, датаркнулася ногцем к падашве—адчула ў сярэдзіне боль, бы балячку калупнуў хто.

— Ай, яй, якія-ж важныя боты былі, асабліва раніцаю на назе мужа—прывабныя, пасьля таго, як нанач Пракоп старанна ўшмальцоўваў іх дзёгцем. А як музычна рыпалі яны новыя—смакуе Арына.—Дарэмна адзела я іх. Трэба было ў лапцях шкандыбаць. Па сухому-б ці мала яшчэ Пракоп пашкрабаў, а так прыдзецца галоўкі даваць.

Арына памацала яшчэ раз падэшву, задумалася:

Зараз у хату хоць вачэй не кажы, загрызе сьвякруха, поедам заесьць. І так дапякае штодня: „Дакуль па сходам сваім будзеш боты гнаіць? Служка дарэмная. Ня дзіва-б блазьнё, а то дзяцей роўных з сабою нагадавала, а да сходаў ліпне, як дзеўка да музык.

Арына дзесяць раз змоўчыць, адзін—агрызнецца:

— Ці ты за мяне работу робіш?

Сунімецца старая. Але як толькі трапіць да Ціта на вячоркі, навядуць людзі—зноў пачынае спачатку.

Чым вабілі да сябе сходы, Арына і сама доўга таго не ўяўляла. Весялей і сьмялей неяк у людзях. Упяршыню на сход яе сілком зацягнулі, якраз савет абіралі тады. Наказалі: „Што хоць

рабі, а на сходзе каб была". Прышла. На двары пастаяла, у вакно зазірнула. Нялоўка заходзіць у хату было. Мароз—аж трашчыць. Пад вокнамі жанок з восем. Ланцужком у хату вайшлі—клямку пільнуюць. Памаўчалі, а пасьля разам усе загалдзелі. Мужчыны раззлаваліся:

— У, сарокі! Гэта вам ня попрадкі, а справы апчэсьцьвеныя!

Сорам стала. Сьціхлі. Пачалі прыслухоўвацца, абрыўкі прамоў лавіць.

Тужыцца Арына, аніяк неўкладаецца даклад у галаве, бы суча ў жбанку, корчацца, муляюць.

Усе рукі паднімаюць, і Арына за імі, за людзьмі. Дзе больш рук, там і яна сваю ўтаркне, сарамліва азіраючыся па бакам.

Яшчэ неяк раз сама на сход трапіла. Пракопа тады дома ня было, на начлезе заначаваў. Гаварылі пра насеньне. Раскусіла Арына; дзеляць насеньне, выходзіць. І калі дайшла чарга да Паўліка засьцянковага, Арына зьдзівілася: „Навошта яму, калі свайго па горла? Вось заідраснае вока, папоўскае". Хацела супроць яго руку падняць, але не асьмелілася.

І толькі аднойчы на бядняцкім сходзе Арына разжавала навошта сходы, чаму руку трэба паднімаць ня толькі „за", але бывае і „супроць". З гэтага часу рэдкі сход абыходзіўся без Арыны. Ужо не парог пільнавала яна, а праходзіла далей.

Ды што там свой, вясковы сход. Неяк Арыну аж на зьезд паслалі.

Мялася яна нялоўка сярод чужых людзей, а пасьля і тут абсвойталася: „Не ваўкі, не зьядзяць. Там Арына—небарачку, а тут—Арына Ліпоўская—дзілігат, во што!"

Побач—дзяўчына чарнявая, у кажушку. Узышла яна на падмосткі, гаварыць стала. Браткі мае, сяструхны! Нібы каваль у ёй сядзіць, словы куе. І так дадна, адно да другога прыстае: школа, дарога, каапэрацыя.

Скончыла чарнявая, Арына да яе туліцца:

— Вы гарадзкая мабыць?

— Не, з вёскі мы, з саўгасу.

Зьдзівілася Арына, журыць сябе: „Людзі як людзі, а мне бы цяляты язык аджавалі". Адважылася, і... бух пісульку на стол, значыцца, каб гаварыць дазволілі, а ў самой сэрца—як ня вылеціць: тук-тук-тук; дрыг-дрыг-дрыг. Маткі сяструхны, і навошта я тую пісульку кінула? Аб чым гаварыць немаведама. Ух, млосна! лягчэй жыта з паўкапы змалаціць.

Адна на адну насядалі думкі, дрыжалі, цісьлі, перапляталіся ў адзін кастравы клубок. Дзе там выцягнеш якую з іх?!

Што тут рабіць? Можа выйсьці?

Ногі затрамцелі, калі старшыня назваў яе прозьвішча. Некалькі хвілін маўчала—язык да неба прырос, не варухнецца.

— Пра што-б гэта мне?..

Момант, і заблытанасьць усю як рукою зьняло. Арына ўспомніла Зьмітрыка. Людзі ўжо не палохалі яе, Арына не прыкмячала нікога. Перад вачыма яе мянёндзамі адлівалі хварбы Зьмітрыкоўскага фольварка: дамок, гумны, сад, батрачка. Словы сыпаліся як з меха, хто толькі назапасіў іх там?

— Сырам у масьле плавае Базыль, а яго куртульнікам лічаць; паперы ганаровыя, падарункі, ільготы розныя даюць—званіла Арына з запалам. А пасьля і сама зьдзівілася, адкуль столькі сьмеласьці ў яе.

Няхай-бы хто з нашых вяскоўцаў быў, паслухаў!

Пасьля-ж усяго гэтага, калі абіралі савет,—уся беднота за Арыну руку падняла.

Цешыць усё гэта Арыну: што ў сілах — зраблю. Пракоп ня супярэчыць. Вось маці толькі сьвякруха, як іржа жалеза грызе.

З такім яшчэ-б можна жыць, не бяда. А што рабілася, калі Ўладзя нарадзіўся. Мусіць зроду яшчэ ня бачыла таго хата.

Устала Арына пасьля парадзельля. Дзень мінуў, тыдзень. Адна суседка ў хату тыц, другая.

— Калі хрысьціны спраўляеце?

У піліпаўку справа была. Хлеба—ні скарынкі. Папу за хрышчэньне—3 пуды. А дзе-ж іх выскрабеш? Украсьці, ці якое ліха? Мароз люты, аж трашчыць. Гной у хляве—сукрак сукраком. Дым з каміноў бы стрэлка, ані калыўнецца слум. Вусы ў людзей пасівелі, інеем абрасьлі. Канаплянікі і тыя вымерзаць пачалі: сядзіць на дрэве, нашаперыцца, а пасьля кулдык, і ногі выцяг. Вось якая зіма была. Куды-ж ты дзіця панясеш—суцяшаюцца ў хаце. Адлегі чакалі. А за часам ня ўгонішся.

— Як будзем з дзіцём?—аднойчы запытала Арына мужа.

Пракоп бараду шчыпнуў, спакойна адказаў:

— Што там з дзіцём? Пайдзі ды запішы.

— А хрысьціць? разьзявіла рот сьвякруха.

Якое—там хрысьціць? Хлапцу хутка паўгода.

— Згубіла ўнучка нячыстая сіла—загаласіла старая. Няма ведама ва што хварбавалася ёй у гэту хвіліну і калыска і ўся хата.

Малое-ж не мяшалася ў спрэчкі. Яно ляжала спакойна за полагам, крактала, спадзяючыся, што гэту частку яго лёсу—вырашаць правільна самі бацькі. Вядома, калі-б дзіцёнак здолеў загаварыць, бабцы радасьці ня чуць, бо з думкамі таты і мамы, у малога была-б поўная еднасьць. Каму гэта соладка ўзімку, у мароз,—апыніцца ў бруднай сьмярдзючай вадзе, ды яшчэ голенькаму? Лёгка бабцы ныць на мурку седзячы, ды сьпіну грэючы. А бабка такі ныла ня мала.

А бот пазірае і так нагла сьмяецца.

І што гэта за сьвет такі сёньня настаў? Няхрышчаным дзіця пакідаюць. Паенчыла сьвякруха і сьціхла. А Пракоп запісаў сына, назваў Уладзімірам. Было работы і суседзкім языкам. А хлапча расло пруткім, як грудка, жвавымбы ў'юн. Зараз Уладзі ўжо шосты гадок.

II.

Сельсавет бітком набіты, недзе куры дзеўбануць. Якраз лістаносец пошту прынёс.

Арына здала заяву старшыні, той аглядзеў подпісы, бы частакол настаўленыя і крыжыкаў некалькі між імі налеплены няпісьменнымі,—палажыў заяву ў нутраную кішэню пінжака. Арына далажыла аб тым-сім, што ў вёсцы чуваць, намерылася паварачваць аглоблі.

— Арыне Ліпоўскай—адчаканіў нехта выразна.

Арына азірнулася, пачуўшы ўласнае прозьвішча. Зьдзівіла яе гэта, бо ў вёсцы яе ведалі ўсе толькі як Арыну Пракопаву.

— Хто-ж бы ў нас з дзявок такіх?—меркаваў малады хлапец, перабіраючы пісьмы.

— Ты ня ведаеш такое?—пытаюць Арыну.

Маладзіца перакінула ў мазгу знаёмых дзяўчат. На сабе ня спынілася, бо за ўсё жыцьцё пісем ня мела.

— Ха-ха-ха-ха—пакацілася па хаце. Далібог, яна самая Арына Ліпоўская. Вось праваліцца мне скрозь зямлю, калі брашу. Няма ў нас ніводнай Арыны Ліпоўскай акрамя Пракопавай.

— Це-це-це—галубка. У Пракопа з пад носу крадуць. Палюбоўнічкаў завяла, перапісачка—жартаваў усё той самы прыземісты, рыжавусы дзядок.

Арына не разумела ў чым справа. Вабіла зазірнуць у пісьмо, але саромілася, каб не ўкляпацца часамі.

— Сьмешкі ладзяць—падумала яна. Зноў націснула на клямку. Але ўспомніла, што трэба для ўсёй вёскі газэты і пісьмы захапіць. Падышла да стала, папрасіла настаўніка адабраць патрэбнае. Той перадаў пакунак, а зьверху найвялікшы пакет—асабіста ў рукі ёй.

— Гэта табе—дадаў ён сур'ёзна.

Кінула вокам коса, ледзь разабрала надрукаванае ўласнае імя і прозьвішча.

Гэта табе.

— Дома і прачытаць некаму. Мы з Пракопам аднолькавыя грамацеі: ледзь адрозьніваем літары ад баранкаў—падумала Арына. Цікавасьць брала, каму і навошта яна ў галаву заблудзіла.

— Прачытайце Яўген Пятровіч—папрасіла настаўніка.

Той не сьпяшаючы разадраў канвэрт, выняў надрукаваны лісток, прачытаў:

„Райвыканкомам вы, як сябра сельсавету, намечаны для пасылкі ў Менск, на курсы грамадчыц пры Цэнтральным Выканаўчым Камітэце".

— Хо-хо-хо—закаціўся Рыгорак:—Арына Пракопава ў Менск, на курсы.

А Вінцусь малы падскочыў, выгнуўся кульбакай сьмешна, ляснуў аднэй рукою па задрыпанаму каптанку, а другою—сьціскаючы недалужна шапчыну, абвёў паўкруг у паветры, пакланіўся нізка:

— Як маецеся, таварыш студэнтка—перадражніў ён.

Разнакаляровыя агеньчыкі замігалі ў вачох Арыны. Адкуль гэтакая напасьць; сорам перад людзьмі?—пытала яна сябе, ня ўдумваючыся ў зьмест неспадзявана атрыманага закліку.

А людзі гулі, прыдумлялі, сьмяяліся. Водгукі іхняй гаворкі нешта няпрыемнае адбівалі ў галаве маладзіцы.

— Ну і што-ж, калі напісалі, за вошта на сьмех падымаць?—нэрвавала Арына—мо, зайздрасьць бярэ?

Але на гэтым слове яна злавіла сябе:

— Якая там зайздрасьць? Каму лёгка сёньня ад сярпа, ад жніва адарвацца, ліха ведае куды і навошта? А зімою што: зубы хіба на паліцу?

У кутку мужчыны нядобрае гавораць: хто ведае, з чым параўнаюць Арыну.

— Годзі зубы скаліць. Вы не ў карчме—спыніў старшыня савету:—Тут ніхто ня змушае, а толькі намецілі Арыну. Яе справа: паедзе, дык што-ж, можа ёй улетку няма такое работы. А не—другога сябра савету пашлем, можна будзе падабраць каго-небудзь—заключыў старшыня.

— Ну, што ты скажаш?—зьвярнуўся да Арыны.

— Ня ведаю. З Пракопам абгаворым—ціха адказала яна.

(*Працяг будзе.*)

Недахопы пад абстрэл.

Непарадкі вялікія ў нашым саўгасе Цяцерына: жывёла бяз догляду, хлеў разбурылі, сьвіньні сярод двара плаваюць, а хлявоў няма, бо разбурылі іх ня ўмовіўшыся з майстрамі. Зіма прышла, а сьвіньні на двары топяцца. Сялянам кажуць: „хлявы ўцяпляйце“, а самі прыклад кепскі падаюць.

Бульбу ссыпалі ў капец і ў леднік мерзлую і розную, зараз бульба ў ледніку загнілася і прыдзецца яе перабіраць: зноў грошы плаціць.

А садоўніца дарэмна 50 рублёў атрымоўвае, нічога ня робячы.

Сястра загадчыка саўгасу на дойцы была, і мела ключы ад масла, яна спрабавала ўкрасьці 720 грам масла, але папалася. РКК зьняла яе з работы.

Пасьля звальненьня сястра загадчыка схавала вінт ад сэпаратара. Малако псуецца без перагонкі. Рабочыя зрабілі вінт на свой кошт, і толькі пасьля вінаватая сама знайшла вінт у гнаі заржаўлены.

Загадчык саўгасу Цяцерына выдае хлеб рабочым, калі ўздумаецца яму. Рабочыя зьвяртаюцца ў канэрацыю за хлебам, а калі бывае і да кулака прыходзяць. Гэта ў той час, як у саўгасе запасы хлеба заўсёды ёсьць.

З заработку рабочых штомесячна робяць адлічэньні. Мы кодэксаў законаў аб працы ня ведаем і ніхто ня тлумачыць нічога. На што гэта робяць адлікі.

За пераработку часоў не аплачваюць. Мужчыны настаяць, дык ім аплацяць перароблены гадзіны, а жанчыны працуюць зранку да вечара—і ніякай даплаты ня бачаць.

Захварэе работніца—хурманку к доктару не даюць, з вёскі наймаюць, ня гледзячы, што па дагавору гэта прадугледжана, а загадчык матку сваю возіць.

Бяруць рабочыя прадукты па аднэй цане, а вылічваюць паболыш. Таксама пры найме падзёншчыкаў. Нават ёсьць выпадкі, што дні рабочых ня ўлічваюць.

Калі зайдзе да загадчыка селянін ці работніца, дык ён пагутарыць толькі з тымі, хто падабаецца яму, а на астатніх толькі як былы пан прыкрыквае.

Аховы працы ніякай няма. Старшыня камісіі па ахове працы—сакратар партыйнай ячэйкі, мер ня прымае.

Самакрытыкі ў нас няма.

4 работніцы няпісьменныя, і зараз ніводная з іх ня вучыцца.

Сярод рабочых п'янка, хуліганства. Сярод п'яніц ёсьць нават камсамольцы. Ёсьць буян, які нават сялянскага хлапца ў клюбе спробаваў зарэзаць, але нічога ня робіцца, каб спыніць гэта.

У саўгасе арудуюць сэктанткі і знахаркі, у саўхоз прывозяць дзяцей да знахарак.

Самакрытыкі ў нас няма. Рабочыя на сходзе ня выказваюцца—баяцца, таму што пасьля загадчык імсьціць за самакрытыку.

Вытворчая нарада за 5 месяцаў склікалася адзін раз і то актыўнага ўдзелу рабочыя ня прымалі.

Усё гэта не паляпшаецца, ня гледзячы на тое, што загадчык саўгасу атрымаў у Райкоме суровую вымову. Партячэйка ня прымае належных мер да палепшэньня становішча саўгасу. **Даведаўшая.**

Аршанская акр.

Рэдакцыя чакае ад Акрземадзелу і Саюзу Працаямлес—адказу аб прынятых мерах.

Слова за грамадзкасьцю.

Фідлін—камуніст, працуе на фабрыцы „Чырвоная Бярэзіна“. Заглянула я да яго.

Пахне лякарствам. На ложку—худая, пакутная жанчына. Гэта жонка камуніста Фідліна, яна працуе прыбіральшчыцай у дзіцячым ачагу, і ўжо трэці дзень у водпуску—„захварэла“. Дыагноз ураче: „Цяжкі ўшыб сьпіны“... і гэтак далей.

Рукі, ногі гэтай жанчыны—сінякамі размалёваны, яна ледзь паднімае галаву. А ложак пільнуюць дзьве пары спалоханых, сініх, дзіцячых вачэй. Гэта дзеці Фідлінаў.

І Фідлін буйствуе. Большага сынка (9 год) ён спрабуе атручваць „горкаю“, калі-ж той адхіляецца з плачам—Фідлін ведае, чым уплыць на жонку і на сына.

Аднойчы жонка Фідліна не ўцярпела, далажыла пра гэта ў фабком. Але там бюракраты ня вытраўлены.

— Ідзеце ў суд, грамадзянка,— ўчула яна адказ.

Чаму жанадзел дагэтуль не пацікавіцца работаю сярод жонак рабочых. Усім вядома, што Фідлін атрымоўвае ў месяц 70 рублёў, а жонцы ў месяц дае 10 рублёў, а пасьля стукае кулакамі па сталу, крычыць:

Філін дома.

— Падай абед. Гэтага я ня хочу, гэта ня буду, не падабаецца, і гэтак далей.

Пасьля зноў кулакі заходзяць, толькі ўжо не па сталу, а па сьпіне, па галаве жонкі.

На днях ячэйка выключыла з партыі Фідліна. І правільна зрабіла, бо такія, як Фідлін, ня могуць быць сябрамі партыі.

Соня Фрыдлянд.

Н.-Барысаў.

Рашучы адпор кулакам пры выбарах камітэтаў узаемадапамогі.

Тав. Краўцова. Старшыня Чырвонапольскага раённага камітэту ўзаемадапамогі.

У мінулую кампанію перавыбараў КСУ ўдзел жанчын быў зусім нізкі. Усяго па Беларусі ў сярэднім удзельнічала ў перавыбарах 15 процантаў жанчын, к агульнаму ліку маючых права абіраць. Здарылася гэта таму, што адсутнічала падрыхтоўчая праца сярод жанчын з боку нізавых партыйных органаў.

У сёлетняй перавыбарчай кампаніі, якая распачнецца з 15 сьнежня і будзе праходзіць да 15 га студзеня, мы павінны зьнішчыць гэтыя недахопы. Перавыбары КСУ будуць праходзіць ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы ў вёсцы. калі кулак і яго агэнты будуць старацца правесьці сваіх стаўленікаў у органы КСУ, каб пасьля скарыстаць мерапрыемствы КСУ ў інтарэсах заможных. Такім чынам, перавыбары набываюць вялікае палітычнае значэньне і патрабуюць актыўнага ўдзелу з боку ўсёй грамадзкасьці, асабліва жанчын: батрачак, бяднячак, калгасьніц і серадняцкага актыву.

Кожнай жанчыне-дэлегатцы, батрачцы і бяднячцы, дастаткова вядома, што КСУ, як масавая бядняцка-серадняцкая арганізацыя, у суадпаведнасьці з дырэктывамі партыі і ўлады ставіць сваёй задачай аказваць вытворча-калектыўную дапамогу батрачцы бяднячцы, сем'ям інвалідаў, чырвонаармейцаў, чырвоных партызан. КСУ аказвае дапамогу ў час пасеўнай кампаніі, выдаючы насеньне і грашовыя пазыкі, безканёвым бядняцкім гаспадаркам аказвае дапамогу, ў засеве і апрацоўцы поля, збору ўраджаю, падвозцы апалу. КСУ каапэрыруе батрацтва і бядняцкія гаспадаркі ў вытворчыя аб'яднаньні і асабліва ў калгасы за сродкі КСУ.

Уся гэта дапамога павінна ў поўнай меры садзейнічаць уваходу ў калектыўныя аб'яднаньні і вызваленьню беднякоў з эканамічнае залежнасьці ад кулака.

У мінулыя перавыбары ў паасобныя нізавыя органы КСУ пралезьлі чуждыя элемэнты, якія скрыўлялі клясавую лінію (выдавалі дапамогу заможнікам, п'янствавалі, рабілі растрату, зрывалі аказаньне дапамогі батрацтву і беднякам у часы сяўбы). Праца паасобных КСУ ў інтарэсах заможнікаў і сваіх асабістых, у першую чаргу, адбіваецца на запатрабаваньнях жанчыны-батрачкі і бяднячкі, сям'і чырвонаармейца і інваліда, бо заўсёды гэтым колам патрэбна дапамога ў першую чаргу.

Такім чынам перавыбары павінны быць выкарыстаны для рашучага ачышчэньня ад гэтых кулацкіх, чуждых і непрацаздольных элемэнтаў. Замест іх на кіруючую і практычную работу трэба максымальна прыцягнуць батрачак, бяднячак і серадняцак.

Для таго, каб забясьпечыць чоткі клясавы напрамак усёй дапамогі, якая аказваецца камітэтамі ўзаемадапамогі, т эба пры перавыбарах з усёй рашучасьцю выгнаць з органаў КСУ ўсіх тых, хто скрыўляе клясавую лінію.

У перавыбарах і абмеркаваньні кандыдатур і наказаў новаму складу КСУ батрачкі, бяднячкі і серадняцкі павінны прыняць самы актыўны ўдзел. Павінна быць стопроцантная яўка батрачак, бяднячак, дэлегатак і серадняцкага актыву,—на гэтыя сходы, каб даць рашучы адпор кулацтву. Трэба, каб у нова-абраным складзе Камітэтаў Узаемадапамогі было ня менш 25 процантаў жанчын.

Зараз-жа неабходна склікаць жаночыя сходы, на якіх заслухаць справаздачы жанчын, працуючых у КСУ, абгаварыць гэтыя даклады пры шырока разгорнутай самакрытыцы.

Шырокае ўцягненьне батрачак, бяднячак і серадняцкага актыву ў выбарчыя органы КСУ, стопроцантная яўка на перавыбары забясьпечыць чоткае правядзеньне клясавай лініі ў рабоце КСУ і рашучае наступленьне на капіталістычныя элемэнты вёскі.

Перавыбары павінны поўнасьцю спрыяць генэральнай праверцы таго як КСУ ўдзельнічаюць у справе калектывізацыі сельскай гаспадаркі, і ці перабудавалі яны ўсю сваю працу так, каб аказваць належную дапамогу батрачцы і бяднячцы, для ўступленьня іх у калгас.

Л. Жарын.

ГАВОРАЦЬ ГРАМАДЧЫЦЫ

Вылучэнкі—абаронцы беднаты.

У нашым сельсавеце абраны дзьве дэлегаткі, Шотава А., батрачка намесьнікам старшыні сельсавету і бяднячка Хабалова, М. сябрам сельсавету.

У працы ім не дапамагалі, а перашкаджалі. Нават сябры прэзыдыуму сельсавету пасьмелі абзываць нядобрымі словамі батрачку Шотаву.

Шотава ўпарта бралася за працу. Зараз яна намесьнік старшыні сельсавету, старшыня батрачкому, сябр АВК, уступіла ў партыю. Толькі кулакам ня люба праца Шотавай, а для батракоў і беднякоў таварыш Шотава зьяўляецца лепшым абаронцам.

Другая дэлегатка Хабалава таксама з абавязкамі сябра сельсавету спраўляецца добра. Вёска, дзе працуе яна, замест вызначаных сельсаветам 350 пудоў хлеба, здала 530 пудоў каапэрацыі.

Дэлегатка **М. Вільгусевіч.**

Мельціслаўль, Мазалаўскі с.-с.

Жонак вайсковых уцягнуць у грамадзкую работу.

У нас сярод жонак вайсковых ёсьць значная частка актывістак, якія могуць быць вельмі карыснымі ў грамадзкай працы сярод жанчын. Але яны больш варацца ў сваім „катле" і адмяжованы ад агульнай працы. Нават дэлегаткі не наведваюць дэлегацкіх сходаў. Трэба іх уцягнуць у агульную грамадзкую работу.

Жэнарганізатар.

Чэрвень.

Рухавік запэўняе

Так, так, так—пульсуе паравік, напорыста выкідаючы з вузкага горла густа-сівыя вузлы пары. Яны ўзьвіваюцца жывымі пярсьцёнкамі, якія дрыжаць, рассыпаюцца над дахам складзенага насьпех дрывянога будынку, нясуць шумлівыя водгукі далёка, у васеньнюю цішыню.

— Ня інакш млын паравы.

— Не, павінна быць малатарня—спрачаюцца двое, узьбіраючыся на ўзгорак, упрыгожаны рухавымі пярсьцёнкамі пару.

Бліжэй і бліжэй сьмяецца машына, ужо чуваць дыханьне яе, шаркат прывадоў, людзкія галасы.

Неўгадаў ніводзін з спрачаўшыхся,—угадалі абое.

Пасярэдзіне невялічкай каморы сінее машына—у паўчалавека ростам—гэта яна парушае цішыню восені. Яе дыханьне ліецца далёка за ўзгорак, будзіць далі. Яе сталёвыя нэрвы, цягліцы—нестамімы; нестаміма шчабечуць зубчатыя калёсікі.

— Рухавік гэта—тлумачыць Маеўскі—маленькі срэбрабароды дзядуля — старшыня калгасу „Будзёны“.

— Нядаўна набылі яго мы, вельмі дарэчы—рухае млын і малатарню.

Так, так, так—сьцьвярджае машына словы Маеўскага, падае энэргію ў млын, к малатарні. У гумне лапоча веялка. Там калгасьніца, схіліўшыся над горкаю збожжа, сыпле з рукі на руку залатое зярно, любуецца ім. Зярно трапляе ў млын, адтуль праз жолаб выходзіць пухова-бархатнай мукою.

Так, так, так—будзем з хлебам, будзем з хлебам.

— Вось, гумно бітком набіта хлебам, яшчэ немалочаным. А што змалацілі—здалі ў каапэрацыю: 90 пудоў па кантрактацыі цалком выканалі і 50 пудоў лішкаў зьверх здалі ў каапэратыў. А зараз закантрактавалі 12 гэктараў жыта, 12 аўса і 4 гэктары бульбы.

— Гэта першы год існаваньня нашага калгасу. Рухавік набылі, малатарню, жняярку, сеялку, сьвінарнік вялікі будуем—гаворыць калгасьніца Анюта.

— Ня зьдзейсьніліся прараканьні кулацкія, з якімі нас у калгас праводзілі.

Бывала лета-лецкае ў кулака падзёншчыцай працуеш, сьпіны не разагнеш. Лічышся на гаспадарчых харчох. Есьці сядзем—у горле перасядае, бо ў рот табе пазіраюць. А да расплаты прыдзецца—як падачку жабраку аддае кулак заробленае.

Эх, нават успамінаць цяжка аб гэтым!

— Так дзяўчынаю жыла—працягвае апавядаць Анюта-калгасьніца.

— А пасьля замуж вышла, гняздо будаваць пачалі. Куды ня кінься—рукі апячэш. Пуста, гола. Ні кала ні двара—як людзі кажуць.

Пачулі мы, што калгас арганізуецца,—меркаваць пачалі.

А кулаччо каркае над вухам:

— Памятай Анюта: пойдзеш у калгас—воч да мяне не кажы. Здохнеш бяз хлеба—скарынкі ня дам, лепш сабакам выкіну.

А мы меркавалі так: ці то-ж людзі дурныя, што цэлымі раёнамі ў калгасы аб'яднаюцца. Падаліся і мы ў калектыў, большасьць—былыя безьзямельнікі.

Батрачылі мы ў пана раней. Рэвалюцыя. Грамадзянская вайна. У 1924 годзе зямлёю надзяляць пачалі. Адвялі і нам пасёлак, думаем,—зараз зажывем.

— Зямля, зямля,—з захапленьнем радаваліся мы—апавядаюць таварышы Шыпак і Лазоўскі.

Узяліся. Мінае год, два. Хату зьлепіш—няма сьцёбкі, гумна, каровы. Карову набудзеш—недзе дзець яе—хлеў патрэбен. Так і круцішся, як белка ў коле. Крэдыт бярэш—і нібы ў бяздоньне якое ён трапляе.

Стаіць мая хацінка, не перацягваю яе на пасёлак, бо ў галаве сьмелыя думкі завяліся, супакою не даюць.

— У калгас трэба аб'яднацца, кідаць пасёлкі—парашылі мы.

А калі з-пад сьнегу пачала прабірацца зялёная рунь, сабраліся мы з сям'ей, маемасьць у купу склалі. Арганізавалі калгас імя „Будзёнага“, з 8 сямей—45 чал.

Ярыну сеялі гуртом. Гуртом зьбіралі азімае.

Так, мы ўжо не вяскоўцы, а сябры калгасу імя „Будзёны“. А дзе-ж жыць? Няўжо ў тых самых раскіданых хатах?

Не, так праца ня пойдзе спорна. Трэба зьяднацца цясьней.

Дачка генэрала—былога пана Крэчмана аж дагэтуль у доме Колішнім жыла. Мы да яе:

— Прадай дом нам.

Пяць тысяч рублёў за будоўлю прапанавалі—не згадзілася. Ну і лепш яшчэ: зараз дом гэты праз РВК адабралі і жывем тут мы ўсе гуртом.

Свой дом будуем—новы, прасторны. А ў гэтым налета дзіцячыя ясьлі арганізуем.

Калгасу імя „Будзёнага“ яшчэ няма 10 месяцаў. Мае ён зараз 110 гектараў зямлі, 8 коняй, 11 кароў, 25 сьвіней.

З першага-ж дню ў калгасе аб'ядналі ўсе ня толькі буйную жывёлу, але нават і птушку.

Зайдзіце ў хлеў, канюшню, птушнік, кухню, дзе сьвіньням гатуюць. Там заўсёды парадак, адчуваецца руплівая гаспадарчая рука і вока. Праца разьмяркована. Кожны сябра калгасу стала замацованы да вядомай галіны працы.

І спраўляюцца самі. Уся праца ў полі, сенажаці зроблена сёлета рукамі калгасьнікаў.

— Мы не наймаем. Дзе там! Будавацца трэба. Кожная капейка патрэбна. Самі здолеем—кажуць калгасьнікі.

Удалыя ўрадзілі яравыя і кораньплоды. За іх „Будзёнаўцы“ сёлета атрымалі на выстаўцы: клеверны сяўнік, прыладу для догляду саду і палольнік. Нават на ўсебеларускую выстаўку намечаны экспанаты „Будзёнаўцаў“.

Вось першыя крокі калгасаўцаў. Будзёнаўцы на правільным шляху, гэта сям'я моцна спаяная жаданьнем будаваць прыкладную калектыўную гаспадарку.

У дзень калектывізацыі „Будзёнаўцы“ перайшлі на агульнае харчаваньне.

— Мы не галодны, жывём лепш, як калісьці. А галоўнае сьмела сядаем за стол. І толькі ядучы сыты абед калі-небудзь усплыве ў памяці калішняя брыдотная па

дачка кулацкая—кажуць калгасьніцы.

У Будзёнаўцаў многа энэргіі, многа імкненьня будаваць. Але ім яшчэ трэба ў дапамогу—культурная сіла, патрэбен сталы нагляд агранома, які-б дапамог распрацаваць плян далейшага разьвіцьця гаспадаркі, практычна паказаў як ажыцьцявіць гэты плян. Але на жаль...

— Толькі і бачылі мы агранома, як капусту садзілі—заявілі калгасьнікі.

Будзёнаўцы выклікалі на сац. спаборніцтва калгас „Хмелеўка". Тыя прынялі выклік, дагавор заключылі, і... забылі ўсе пра гэта. Забылі „Будзёнаўцы", „Хмелеўцы", РВК і нават Райком партыі. Падшыты дагавор да спраў сумуе, ніхто нават не пацікавіўся зазірнуць у яго. Ды і сам дагавор складаўся ўчарашнімі сялянамі-адналіўнікамі, бяз вопыту будаўніцтва калгасаў, бяз усякага кіраўніцтва агранома.

Будзёнаўцы патрабуюць не назіраньня рэдкага, а кіраўніцтва і дапамогі ў рабоце з боку аграсіл.

Трэба-б РВК „зацікавіць" агранома калгасам ня толькі ў час пасадкі капусты. Многа больш кіраўніцтва і дапамогі чакае „Будзёны".

Жанчыны з калгасу „Будзёнага" досыць згуртаваны, жывуць дружна між сабою, старанна працуюць, жыцьцём у калгасе здаволены, адчуваюць значную палёгку. Але, нажаль, амаль усе яны непісьменныя. Калгасьніцы імкнуцца

Тав. Тоўсьцік.

вучыцца, парашылі зараз-жа прыступіць да вучобы.

Пераважная большасьць калгасьніц—за ясьлі. Але ёсьць дзьве бабулькі з асабістым поглядам.

— Балаваны народ зараз расьце. Жняярку маем, сьпіну гнуць ня трэба, дык яшчэ і ясьлі будуй. А ці так-жа мы вас гадавалі?—стогнуць старыя:—параным макам паілі, калі крык надакучаў.

Глыбокі ўздых мімаволі вырываецца з глыбіні грудзей старое. Невядома, што выціснула ўздых гэты: цяжкія перажываньні, ці зайздрасьць, што жыць пасьпяшылі так.

Але ў адказ зьвіняць галасы маладых мацярок, якія тут-жа пяшчотна калышуць на руках первянцоў.

— А мы макам атручваць ня будзем дзяцей. Мы вырасьцім здаровых крапышоў, самі вучыцца будзем і дзяцей навучым.

— Сёньне-ж 1929 год—многазначна дадае маладая камунарка.

— Мы маем рухавік, жатку. Хутка будзе касарка, снапавязалка і яшчэ не такі ўраджай будзем мець. А там і дынаму паставім, электрычнасьць зазьзяе ня толькі ў калгасе, але і ў суседніх вёсках захопліва ціа калгасьнікі.

І яшчэ больш найстойліва гудзе нядаўна чуваная песьня:

— Так, так, так. Машына, электрыка, і высокі ўраджай на аб'яднаных бязьмежных палёх,—выразна выбівае здалёк рухавік калгасу „Будзёны".

В. Х.

Заслаўскі р-н, Менскай акр.

У КАЛГАСАХ

Калгасьніцы абавязаліся.

Дэлегацкі сход калгасу „Ленінская Беларусь" уступіў у сацспаборніцтва з калгасам „Беларускі Камунар". Уступаючыя ў сацспаборніцтва ўзялі на сябе такія абавязкі:

1. На 100% ліквідаваць няпісьменнасьць сярод жанчын калгасьніц да ўзросту 45 год.
2. Падняць працдысцыпліну сярод калгасьніц.
3. Падпісацца на 3 пазыку індустрыялізацыі, каб кожная калгасьніца мела ня менш як 5 рублёвую аблігацыю.
4. Дэлегаткам калгасьніцам выпісаць усім „Беларускую Работніцу і Сялянку".
5. Адзін раз у тыдзень праводзіць галосныя чыткі.
6. Увясну 1930 году калгасьніцам арганізаваць агульнае харчаваньне. За зімовы пэрыяд больш удзяліць увагі сьвінагадоўлі.
7. Мець сувязь з бядняцкай часткай бліжэйшых вёсак для ўцягненьня жанчын бяднячак, батрачак і сераднячак у калгасы.

Праверку сацдагавароў рабіць два разы ў год, першы раз у траўні месяцы і другі раз у кастрычніку 1930 году.

Жыткавічы, Мазырскай акр. **Анюта.**

Адзінай сям'ёю працуем у калгасе.

У Сеньненскім раёне Гарывецкага сельсавету існуе інтэрнацыянальны калгас „Шлях да сацыялізму". Зусім нядаўна некаторыя калгасьнікі яшчэ хацелі сьвяткаваць старыя рэлігійныя сьвяты, а цяпер усе калгасьнікі сьвяткуюць толькі рэвалюцыйнае сьвята, а ў рэлігійныя—дружна працуюць на гаспадарцы.

У дзень калектывізацыі адчынілі ў калгасе пляцоўку-ясьлі.

Раней на сходах даходзіла да лаянкі паміж яўрэйскімі і рускімі жанчынамі ў гэтым калгасе. Цяпер мы бачым зусім другое: усе жанчыны адчуваюць сябе аднэй сям'ёй. Калгас значна ўзмацніўся за апошні год.

У калгасе ёсьць трактар, складаная малацілка і іншыя сельскагаспадарчыя машыны.

Маецца ў калгасе 80 завадзкіх курэй.

Аплата працы ў калгасе яшчэ ня роўная: мужчыны ў месяц атрымоўваюць на 4—5 рублёў больш жанчын. Гэта тлумачыцца тым, што жанчыны пачынаюць працу на 2 гадзіны пазьней, чым мужчыны; з раньня яны заняты хатняй тупанінай.

Гэта зьявішча можна зьнішчыць; калі будзе ў калгасе агульная сталоўка.

Зараз калгасьніцы задумваюцца, каб стварыць агульную сталоўку.

Сянно, Віцебскай акр. **Ганна.**

Даглядайце птушку.

Попыт на ўсе прадукты птушніцтва, асабліва мяса і яйкі ў сучасны момант надта вялікі. Таму трэба ўдзяліць досыць увагі развіццю птушніцкай гаспадаркі ў Беларусі.

Зараз у шэрагу калгасаў ужо ўзяліся за разьвядзеньне птушак. Але да гэтага часу птушніцкая гаспадарка пастаўлена дрэнна.

У большасьці калгасаў, асабліва новаарганізаваных яшчэ няма агульных птушнікаў, і куры трымаюцца ў дрэных умовах: у хатах пад печкай, альбо ў іншых зусім непрыстасаваных для яе ўтрыманьня мясцох. Няма і чыстых гнёзд для носкі курэй. Нясуцца яны дзе папала, чаму і яйкі зьбіраюцца мараныя і хутка псуюцца. Кормяць таксама курэй недастатна. У бядняцка-серадняцкіх гаспадарках куры трымаюцца яшчэ ў горшых умовах.

У выніку дрэных умоў утрыманьня дагляду і харчаваньня, мы не атрымліваем ад птушкі таго, што павінны мець.

Для таго, каб атрымаць прыбытак ад куры, трэба мець за ёй добры дагляд.

У калгасах у першую чаргу трэба пабудаваць агульныя птушатнікі.

Птушатнік не павінен быць цесным, бо ў цеснаце наглядаецца вышчыпываньне пер'яў, расклёўка яек і гэтак далей.

На адну дарослую куру трэба плошча падлогі ў адзін квадратовы аршын. Тэмпэратура павінна быць ня ніжэй 3 градусаў марозу. Седала для курэй трэба пабудаваць у кутку памяшканьня на адным узроўні, на вышычі 1 аршыну ад падлогі, а 1½—2 вярш. шырыні, таўшыні 1—1½ вярш. Адлегласьць паміж паасобнымі жэрдкамі—¾ аршына, рубы іх закругленыя. Лепей зробіць седала падвеснымі. Гэта аблягчае чыстку памяшканьня.

Для носкі курэй неабходны гнёзды, пабудаваць іх найлепш так, як паказана на малюнку і ўслаць іх чыстай саломаю.

Птушнік.

У птушніку павінны стаяць паілкі з чыстай сьвежай вадой і кармушкі. Каб у птушніку ня было паразітаў—у няглыбокіх скрынках павінен быць попел для купаньня яе.

Для лепшага ператраўліваньня харчоў падсыпаць на падлогу буйны пясок, а для стварэньня скарлупкі ў яйках ставіць у якой-небудзь пасудзіне гашаную вапну.

Калі ў гаспадарцы маецца прыстасованае для курэй памяшканьне і яны ў ім ужо зімавалі, неабходна добра аглядзець яго перад зімой.

З старага птушніка выносяцца ўсё рэчы, якія знаходзяцца ў ім: седала, гнёзда і гэтак далей. Яны ачышчаюцца ад бруду, прамываюцца гарачымі пазанкамі і высушваюцца на сонцы.

У самым памяшканьні даглядаюцца рамы, вокны, дзьверы, усе шчаліны і пазы ў сьценах—ці няма там вошай, кляшчукоў.

Шчыліны, пазы прамачываюцца моцным бярозавым шчолакам, альбо трохпроцантным рашчынам фармаліну. Пасьля гэтага сьценкі і куткі птушніка прамываюцца і пасьля прасушкі ўсё памяшканьне беляць вапнаю, добра прамазваючы рашчынам яе куткі, шчыліны і пазы ў сьцянох.

Гнёзды, седалы, кармушкі ўносяцца ў памяшканьне пасьля абгляду і ачысткі.

Калі няма прыстасаванага птушніка, трэба часова адвесьці і адгарадзіць куток у хляву, дзе было-б сьветла, суха і цёпла.

Трэба памятаць, што пры сваячасовым даглядзе і добрым абсталяваньні памяшканьня куры ня будуць хварэць, добра перазімуюць, рана занясуцца і дадуць гаспадарцы добры прыбытак.

Аграном **М. Канавальчык**.

НА КАНФЭРЭНЦЫІ.

Калгасьніцы абгаварваюць.

На Гарадоцкай раённай канфэрэнцыі калгасьніц удзельнічала 85 жанчын—сяброў камун і калгасаў. Канфэрэнцыя выявіла значную актыўнасьць калгасьніц. Абгаварвалі калгасьніцы ўсе недахопы і дасягненьні калгаснага жыцьця. Аднадушна выказаліся за суцэльную калектывізацыю раёну і абяцалі аказаць усялякую дапамогу Райкому і Райвыканкому ў правядзеньні гэтага ў жыцьцё.

Канфэрэнцыя ўзьняла шэраг важнейшых пытаньняў.

Яшчэ слаба прыцягнуты жанчыны-калгасьніцы да ўдзелу ў калгасным будаўніцтве, у складе праўленьняў калгасаў зусім мала жанчын. Мала ўдзяляецца ўвагі падняцьцю вытворчай кваліфікацыі калгасьніц.

Культурная работа яшчэ не разгорнута: кепска працуюць ліквпункты і жанчыны іх дрэнна наведваюць.

Трэба зьвярнуць больш увагі на бытавыя ўмовы ў калгасах. Ясьлі працавалі толькі ўлетку, а зараз іх няма. Для таго, каб больш стала павесьці культурна-выхаваўчую работу сярод калгасьніц, трэба пашырыць ясьлі ў калгасах.

Рашучую барацьбу павесьці з кулаком, які спрабуе перашкаджаць справе калектывізацыі. Быць застрэльшчыкам у справе арганізацыі калгасаў—вось што парашыла канфэрэнцыя.

М.

Кароста і вашывасьць

Як кароста, так і вашывасьць распаўсюджваюцца там, дзе брудна і цесна. Пры іх хворы адчувае зуд, які прымушае разьдзіраць скуру, на ёй утвараюцца балячкі. Калі ў гэтую балячку пападае бруд, а з ім мікробы,—скура запаляецца, можа давесьці да сур'ёзнага захворваньня.

Каросту выклікае асобы клешч; ён выглядае беленькай кропкай маленькай, але выклікае вялікае неспакойства. Папаўшы на скуру, ён прагрызае верхні пласт яе, утварае сабе ў скуры ходы У гэтых ходах самка адкладвае свае яечкі, а з іх расплоджваюцца новыя клешчы, якія таксама прагрызаюць скуру, робяць у ёй ходы. З паверхні гэтыя ходы падобны на шэраватыя рыскі, на канцы з белаватым пухірком—кропкай. Гэта і ёсьць клешч.

Зуд выклікаецца ўкусам і рухам кляшча па скуры. Асабліва несьцярпімы зуд бывае ўначы, ў пасьцелі, бо ў цяплыні клешч пачынае больш рухацца.

Кляшчы спачатку паяўляюцца ў мясьцінах з больш кволай скурай, якую лягчэй прагрызьці. Таму захворваньне пачынаецца заўсёды між пальцамі, у лакцёвых згібах. Адсюль яно распаўсюджваецца па ўсяму целу.

Несьцярпімы зуд выклікае неспакойства, кепскі сон, таму кароста дрэнна адбіваецца і на агульным становішчы здароўя чалавека.

Кароста—хвароба заразьлівая. Яна перадаецца ад хворага здаровому пры супольным спаньні, здароўканьні за руку і праз розныя рэчы, а дзецям—праз дзіцячыя цацкі. Хвароба перадаецца таксама праз агульны ручнік і гэтак далей. Хатнія жывёліны таксама хварэюць каростай, ад іх таксама перадаецца зараза

Вылечыць каросту вельмі лёгка, калі ў самым пачатку захворваньня зьвярнуцца да доктара.

Надзвычайна неспакойлівым для чалавека бывае вашывасьць. Вош стравуецца крывёю чалавека. Каб здабыць кроў, яна прагрызае скуру, ад гэтага чалавек адчувае надзвычайна няпрыемны зуд.

Вош бывае галаўная і плацяная. Плацяная вош жыве ў хфалдах бялізны і пераходзіць на скуру для здабываньня стравы. Галаўная вош надзвычайна хутка расплоджваецца. Яйкі свае яна прымацоўвае к косам пры дапамозе клейкай змазкі. Гніды, якіх усе ведаюць, гэта яйкі вошы, з якіх пасьля выплоджваецца вош.

Калі вошы на галаве вельмі расплоджваюцца, то на скуры паяўляецца многа гнайнікоў, косы склейваюцца так, што іх нельга расчасаць.

Каб зьнішчыць вошы ў бялізьне і адзеньні, трэба іх перакіпяціць у рошчыне шчолаку. Кіпятак забівае як вошы, так і заплодкі, Аднаго мыцьця без кіпячэньня недастаткова Калі адзеньне перакіпяціць нельга, трэба прагладзіць яго гарачым прасам.

Косы для зьнішчэньня вошай мажуць некалькі разоў газаю, напалавіну перамешанай з маслам і пасьля мыюць гарачай вадой.

Папярэдзіць як каросту, так і вашывасьць вельмі лёгка: для гэтага трэба трымаць у чыстаце косы, скуру, адзеньне і бялізну. Вошы перапаўзаюць з аднаго чалавека на другога, пагэтаму трэба берагчыся блізкага датыканьня.

Калі ў сям'і хто-небудзь захварэе каростаю, трэба абавязкова класьці яго асобна спаць, даць асобны ручнік. Дзіця карасьлівае нельга пускаць гуляць разам з другімі дзяцьмі.

Трэба памятаць, што адзін карасьлівы можа зарасіць вельмі многіх.

Гольдэнберг.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА.

Тав. Пішчыкавай, Ліцьвінавай і іншым, хто пісаў аб перавыбарах дэлегацкіх сходаў. Пішэце аб працы новых дэлегацкіх сходаў, як скарыстоўваюцца на грамадзкай працы мінулагоднія дэлегаткі.

Дэлегатцы—Ваш допіс мы пераслалі ў газэту „Рабочий".

Марожка—Ваш допіс аб малых батрачках мы пераслалі ў „Піонэр Беларусі".

Анюце—Ваш допіс аб чыстцы партыі мы пераслалі ў газэту „Зьвязда".

Тав. Роявай—„Цыганскі пасёлак"—пераслалі ў „Беларускую Вёску". Вершы вашы мы не друкавалі—слаба напісаны. Пішэце аб ліквідацыі няпісьменнасьці, як дэлегаткі і наогул працоўныя сялянкі ліквідуюць сваю няпісьменнасьць.

Альтшулер Верш друкаваць ня будзем, распрацованы слаба, пішэце лепш, як у вашым раёне арганізавана работа вакол часопісі.

Лісоўскі—Друкаваць ня будзем, пішэце аб жыцьці і працы калгасьніц.

М. Чабор—Частушкі слабы, друкаваць ня будзем.

Н.—Аб нарадзе калгасьніц друкаваць ня будзем. Пішэце як праводзяцца ў жыцьцё пастановы нарады. Вельмі добра было-б, каб вы напісалі падрабязна аб жыцьці аднаго якога-небудзь калгасу, умовы працы калгасьніц.—асабліва арганізацыя быту; агульнае харчаваньне, ясьлі, дзіцячыя пакоі, ліквідацыя няпісьменнасьці і наогул аб культурным абслугоўваньні.

Кандрашэвіч Арына—Аб судзе друкаваць ня будзем. Пішэце аб практычнай працы жанчын—сябраў саветаў, аб зьнішчаньні няпісьменнасьці

Рудзінай—Заметку друкаваць ня будзем, бо справа ўжо ўскрыта і знаходзіцца ў судзе. Пішэце, як удзельнічаюць работніцы ў грамадзкай рабоце, як ім дапамагаюць у іх працы, як праводзіцца ліквідацыя няпісьменнасьці.

Дэлегатцы—Аб Дановіч Груні - друкаваць ня будзем. Аўтар не паведаміў сапраўднае прозьвішча.

Шнэяровай—Аб урачыстасьцях ня пойдзе.

Піхнасік і Шэр—Частушкі вельмі слабыя—друкаваць ня будзем

Аляхновіч—З вашага допісу ня відаць, на якія-ж хібы ў рабоце дэлегацкага сходу зварочвалі ўвагу дэлегаткі.

Табачнікавай - Вашу скаргу мы пераслалі ў пракуратуру рэспублікі.

Хамяковай—Напішэце больш падрабязна аб імкненьні бяднячак і сераднячак у калгасы. Напішэце таксама аб умовах працы і быту калгасьніц.

Карэспандэнцыя аб абслугоўваньні калгасаў аптэчкамі пераслана ў „Беларускую Вёску".

Званковіч Аб сьмерці Званковіч друкаваць ня будзем, пішэце, як вядзецца праца з жанчынамі сябрамі саветаў, як уцягваюцца жанчыны ў калгасы ў вашай вёсцы.

Выдавец—Аддзел работніц і сялянак ЦК КП(б)Б. *Рэдактары:* С. Крэмер. Г. Рагазіньнікава.

Друкарня БДВ. Заказ № 760. У ліку 16.000 экз. Галоўлітбел № 608.

##3н//193936(050)

1964 г.

B0000000226 1577

÷ ПРИЛ.
КN 22

Б 05. [redacted]

Беларуская работніца і салянка

№ 24

1929 г.

30К-1
1844